ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 98 (1735) | Пятніца, 7 снежня 1962 года | Цана 4 кап.

У ГЭТЫМ НУМАРЫ

ВЫСОКАЯ ПРАЎДА І ГУМАНІЗМ САВЕЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

ДА ПАЧАТКУ ДЭКАДЫ САМАДЗЕЙНАСЦІ—ТРЫ ДНІ НОВЫЯ СПЕКТАКЛІ МАГІЛЯЎЧАН

ФЕЛЬЕТОН Л. ВІРНІ

ВЫСОКАЕ ПРЫЗВАННЕ

СЕСІЯ АГУЛЬНАГА СХОДУ АКАДЭМІІ МАСТАЦТВАЎ СССР

Пяць дзён у Маскве праходзіла справаздачная сесія Акадэміі мастацтваў СССР. Яе ўдзельнікі падвялі вынікі вялікай і плённай дзейнасці калектыву мастакоў і мастацтвазнаўцаў, аб'яднанага акадэміяй. Работа сесіі праходзіла пад знакам барацьбы за высокае і сапраўды цудоўнае мастацтва сацыялістычнага рэалізму, за паспяховае ажыццяўленне велічных задач, якія паставілі перад мастацкай інтэлігенцыяй нашай краіны XXII з'езд Камуністычнай партыі, праграма пабудовы камуністычнага грамадства, прынятая ім.

Натуралька, што асабліва жывым і актыўным з'явіўся водгук калектыву акадэміі на наведанне кіраўнікамі партыі і ўрада выстаўкі, прысвечанай 30-годдзю Маскоўскага аддзялення Саюза мастакоў. Словы таварыша М. С. Хрушчова аб тым, што «ў кіраўніцтве мастацтвам патрэбна ідэйная паслядоўнасць і прынцыповасць, яснасць, выразнасць і непрымірымасць да любых ваганняў і адступленняў ад галоўнай лініі развіцця нашага мастацтва — мастацтва народа, які будуе камунізм», горача падтрымалі ўсе ўдзельнікі сесіі.

У сваім выступленні мастак А. Пластаў гаварыў пра незвычайную прагу да мастацтва, што існуе ў нашага народа. Выхаванню творчай моладзі прысвяціў сваё выступленне С. А. Грыгор'еў.

Значнае месца ў спрэчках займала пытанне аб традыцыях і наватарстве. Пра гэта гаварылі А. Дэйнека, В. Каменаў, М. Манізер.

Цікавасць прысутных выклікала прамова В. Сярова, у якой ён расказаў пра гутарку М. С. Хрушчова, кіраўнікоў партыі і ўрада з мастакамі ў час агляду выстаўкі.

У рэзалюцыі, прынятай сесіяй агульнага сходу, гаворыцца: Акадэмія мастацтваў СССР заклікана ўсёй сваёй дзейнасцю высока несці сцяг сацыялістычнага рэалізму, няўхільна і паслядоўна развіваць яго прынцыпы, паслядоўна і непрымірыма змагацца з любымі адступленнямі ад галоўнай лініі развіцця нашага мастацтва—мастацтва народа, які будуе камунізм.

На заключным пасяджэнні выступіла міністр культуры СССР К. Фурцава.

Удзельнікі агульнага сходу выбралі пяць правадзейных членаў і восем членаў-карэспандэнтаў акадэміі. Правадзейнымі членамі акадэміі выбраны М. Анікушын, М. Божы, Е. Кібрык, Ю. Піменаў, В. Фаворскі. Членамі-карэспандэнтамі: Б. Віпер, А. Канеўскі, Л. Кербель, А. Мыльнікаў, К. Раждзественскі, Э. Окас, Е. Маісеенка, Г. Ханджан. Выбран новы склад прэзідыума. Прэзідэнтам акадэміі аднагалосна выбран В. Сяроў. Віцэ-прэзідэнтамі — М. Манізер і А. Дэйнека.

У сваёй заключнай прамове на сесіі прэзідэнт Акадэміі мастацтваў В. Сяроў гаварыў аб тым, што савецкія мастакі, натхнёныя клопатамі і пастаяннай увагай партыі і народа, поўныя жадання ствараць творы, вартыя нашай вялікай эпохі.

Як вялікую падзею ў жыцці мастацтва, адзначае прамоўца нядаўнюю сустрэчу мастакоў з кіраўнікамі партыі і ўрада на выстаўцы работ маскоўскіх мастакоў. М. С. Хрушчоў, кіраўнікі партыі і ўрада ясна вызначылі асноўныя задачы, што стаяць перад дзеячамі культуры.

Я люблю цябе, Мінск!

У Мінск прыходзіць раніца. Яе прыкметы... Між іншым, прыкметы яе кожны чалавек успрымае па-свойму. Адпаведна не толькі свайму распарадку дня, але, калі хочаце, і сваёй прафесіі. Так, так, прафесіі. Бо мастак, напрыклад, не праміну́ў бы сказаць, што першыя прыкметы раніцы горада для яго ажываюць у цэлай гаме фарбаў, у гэтым тонкім пераходзе ад шэравата-жамчужных таноў да светла-ружовых. Ад светла-ружовых да нейкіх іншых, заўсёды новых, заўсёды для яго, для мастака, непаўторных. Публіцыст праз гэтае слова перадаў бы ўсё, не абмінуў бы слова «рытм». І што можа ахапіць зрок, слых і пачуцці чалавека: і дворнікаў, першых вестуноў раніцы, і пазыўныя радыё, і нагружаныя свежымі прадуктамі аўтамашыны ля магазінаў, і той велічны, манументальны паток людзей, што цячэ паўнаводнаю ракою кожную раніцу да заводскіх прахадных.

Фотамастак таксама мае права на індывідуальнасць у сваёй творчасці. Візітную картку новага дня горада, дня працы, дня адпачынку, дня вялікіх і маленькіх чалавечых радасцей і звычайных клопатаў, у сваім фотаальбоме «Я люблю цябе, Мінск!», які выходзіць з друку у Белдзяржвыдавецтве, ён прад'яўляе вось так:

— Добрай раніцы. мама і тата!

Добрай раніцы табе, юны мінчанін. Добрай раніцы табе, наш Мінск...

«Ул. І. Ленін за работай». Скульптар В. Папоў.
З рэспубліканскай мастацкай выстаўкі 1962 года.

НА АБЛАСНЫХ ПАГЛЯДАХ

І САМАБЫТНАСЦЬ, І МАСТАЦКАЯ ДАСКАНАЛАСЦЬ

В. БУРНОСАЎ

Калі пачалі абмяркоўваць вынікі агляду мастацкай самадзейнасці Магілёўскай вобласці і адбіраць нумары для паказу ў Мінску, старшыня журы, намеснік начальніка абласнога ўпраўлення культуры Васіль Іванавіч Шмудзянкоў папярэдзіў, што на аглядзе ў сталіцы рэспублікі магіляўчанам будзе адпушчана толькі дзве гадзіны сорак мінут — столькі, колькі займае звычайны канцэрт. Такімі ўмовамі члены журы і кіраваліся, адбіраючы самым строгім чынам. часам нават з празмернай патрабавальнасцю нумары, якія трэба паказаць на сталічнай сцэне.

І ўсё ж пасля чатырохгадзіннага абмеркавання аказалася, што адабрана было нумароў для выступленняў аж на восем з лішнім гадзін. Як жа так, здаецца ж, адбіралі толькі самае лепшае, пакідаючы той ці іншы нумар у раздзеле «кандыдаты ў кандыдаты», прыдуманым тут жа Ларысай Пампееўнай Александроўскай. А тут Васіль Іванавіч папярэдзіў, што прагледжанае за два дні на сцэне Палаца культуры завода штучнага валакна — толькі частка самадзейнай культуры Магілёўшчыны. Бо самадзейнасць усходніх раёнаў вобласці — Касцюковіцкага, Краснапольскага, Крычаўскага, Мсціслаўскага, Клімавіцкага—падводзіла свае вынікі ў Клімавічах, а раёны паўднёвай зоны — Бабруйскі, Кіраўскі, Глускі, Асіповіцкі, Клічаўскі — пасылалі свае калектывы ў Бабруйск. Туды таксама выязджалі члены журы, прадстаўнікі грамадскасці і друку, і там таксама рабіўся патрабавальны адбор кандыдатаў для ўдзелу ў заключным канцэрце ў Магілёве і для паездкі ў Мінск.

І тады, пасля кароткага перапынку, члены журы зноў пачалі абмяркоўваць кожнае выступленне. Кожны з іх — спецыяліст таго ці іншага жанра мастацтва — пільна стаяў на варце інтарэсаў гэтага жанра. Так, Ларыса Пампееўна, напрыклад, ніколі не пагадзілася б, каб хто-небудзь прапанаваў выкрасліць урывак з оперы «Іван Сусанін» у выкананні самадзейнага калектыву Горацкага раёна. Яна ахарактарызавала вакальныя даныя галоўнай выканаўцы А. Рыбаковай як выдатныя, багатыя. Кампазітар М. Наско трывожыўся за лёс лепшых харавых калектываў, а знаўцы танцавальнага мастацтва пераканаўча даказвалі вартасць таго ці іншага нумара. Узнікалі спрэчкі, у якіх выказвалася нямала горкіх ісцін. Калі выступленні такіх калектываў, як сімфанічны аркестр пад кіраўніцтвам М. Салдатава, аркестр народных інструментаў пад кіраўніцтвам Л. Кагана, мужчынскі вакальны ансамбль Магілёўскага педагагічнага інстытута, танцавальная група Палаца культуры завода штучнага валакна пад кіраўніцтвам М. Кіракозава выклікалі аднадушнае адабрэнне, дык выступленні іншых заслугоўвалі слушных папрокаў.

Нямала заўваг было выказана ў адрас Магілёўскай народнай харавой капэлы. У выступленнях Л. Александроўскай, М. Наско, Ул. Гарачуна, мастака П. Нікіфарава адзначаліся сур'ёзныя недахопы капэлы. Кіраўнік капэлы А. Мысаў пагадзіўся, што калектыву трэба больш настойліва шукаць сваё творчае аблічча, павышаць культуру гучання, удасканальваць самую знешнюю манеру выканання.

Былі зроблены сур'ёзныя і слушныя заўвагі наконт касцюмаў. На іх затрачаны велізарныя сродкі, а, па агульнаму прызнанню, пашыты яны дужа безгустоўна. У ходзе спрэчак высветлілася, што касцюмы былі пашыты па эскізах, ухваленых аўтарытэтнымі работнікамі мастацтва, як касцюмы беларускія, нацыянальныя. Выступаючыя ж рэзка пярэчылі, што гэта касцюмы не нацыянальныя. Тады ўсе прыйшлі да вываду, што ў нас да гэтага часу няма поўнай яснасці, якім жа павінен быць сцэнічны нацыянальны касцюм, што час ужо, каб і Міністэрства культуры БССР, і Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук, і рэспубліканскі Дом народнай творчасці ўрэшце вырашылі гэтую праблему.

Той, хто прысутнічаў на аглядзе самадзейнасці ў Магілёве і меркаваў аб ёй толькі па выступленнях гарадскіх калектываў, мог зрабіць вывад, што на Магілёўшчыне не ў пашане беларускі нацыянальны рэпертуар. Сапраўды, у самадзейнасці самога Магілёва мала нумароў беларускага рэпертуару. Затое самадзейнасць раёнаў вызначаецца пільнай увагай да свайго, беларускага, нацыянальнага.

Самая ж прыкметная адзнака рэпертуару — гэта творчыя пошукі, імкненне звязаць яго з нашай сучаснасцю, з працоўнымі справамі і думамі будаўнікоў камунізма. Аматары самадзейнасці прывезлі на абласны агляд многа новых, арыгінальных музычна-драматычных кампазіцый, песень і вершаў, танцаў і частушак. «Песня пра Слаўгарад», «Клічаўскі вальс», «Касцюковіцкі вальс», «Мсціслаўская лірычная», «Горацкая» — вось назвы толькі асобных песень, створаных самадзейнымі паэтамі і кампазітарамі. І трэба сказаць, што лепшыя з іх хораша прагучалі на сцэне, даносячы да слухачоў веліч і прыгажосць душы нашага сучасніка. Перапоўненая калі яны выкочваліся на магілёўскай сцэне, там, дзе толькі што выступалі калектывы з добрай мастацкай культурай, адразу адчулася адсутнасць элементарнай зладжанасці галасоў: чатыры галасы гучалі, як адзін, кожная спявачка старалася перакрычаць сваю таварышку.

Дрэннае ўражанне пакінуў і танец «Радасць даяркі» ў выкананні сельскага калектыву Магілёўскага раёна. Танец меў толькі знешнюю форму: дзяўчаты ў белых халатах скакалі на сцэне. Але ні таматычна, ні па рысунку танца не апраўдвалася дакларавaная ў ім радасць даяркі. На месцы добрай славай карыстаецца і нумар агітбрыгады Магілёўскага раёна з сатырычнай гарматай, калі пасля кожнага выбуху ўяўляемага снарада паведамляецца, што ён нанёс удар па бюракрату ці гультаю. Але ж яму дужа нестае творчай выдумкі, мастацкай культуры. Выступаў на аглядзе і рабочы саўгаса Уладзімір Корбан. Гэта зусім яшчэ малады хлопец — і па ўзросту, і па ўдзелу ў самадзейнасці. Усе прысутныя адразу адчулі, які ў яго прыгожы і багаты бас. Але ж зноў такі, голас яго нікольскі не пастаўлены, у яго няма элементарных навыкаў спявання.

І вось другі, адваротны, бок падобнай жа з'явы. Вядомы ў рэспубліцы хор сяла Княжыцы Магілёўскага раёна быў зусім у заняпадзе. Жанчыны зрэдку збіраліся, спявалі, але зладжанага калектыву не было. І варта было прыехаць у Княжыцы музычна падрыхтаванаму чалавеку — Беразуевай, як хор зноў набыў сваё творчае аблічча.

Мастацкая самадзейнасць вёскі не можа далей развівацца і ўдасканальвацца без дапамогі людзей, якія валодаюць музычнай культурай. Толькі ў спалучэнні самабытнасці і высокай мастацкай культуры самадзейнасць зойме належнае месца побач з прафесіянальным мастацтвам. Гэтую задачу можна вырашыць толькі пры ўдзеле ўсёй нашай грамадскасці.

КАМПАЗІТАРЫ ДАЮЦЬ АЎТОГРАФЫ

У салоне Мінскага дома грамафонных пласцінак гучыць знаёмая мелодыя. Прысутныя яе пазнаюць адразу — гэта песня з кінафільма «Каханнем трэба даражыць». Але аматары музыкі слухаюць не пласцінку. У салоне прысутнічае аўтар песні кампазітар Ю. Семяняка. Ён выканаў свой твор на фартэпіяна...

— А цяпер падпішыце мне аўтограф на вашай пласцінцы,—просіць кампазітара рабочы Мінскага завода аўтаматычных ліній П. Ражкоў.

У Ражкова не толькі пласцінка Ю. Семянякі. Ён—аматар беларускай музыкі. І ў гэты дзень набыў многа новых твораў на роднай мове.

За Ражковым да кампазітара падыходзяць другія пакупнікі.

Так пачалася адна з сустрэч працоўных сталіцы з кампазітарамі. У Дом грампласцінак прыйшлі Я. Цікоцкі, М. Аладаў, А. Багатыроў, М. Шнэйдэрман. Яны расказалі наведвальнікам магазіна пра тое, над якімі творамі працуюць, пра свае задумы і планы. Гутарка была цікавай і простай. Кампазітары адказвалі на шматлікія пытанні пакупнікоў, выконвалі свае творы, давалі аўтографы.

Такія сустрэчы работнікі Дома грамафонных пласцінак будуць наладжваць штомесячна.

Прапагандуюць рашэнні Пленума

У гэтыя дні жыццё культасветустаноў Асіповіцкага раёна напоўнілася новым зместам. Работнікі бібліятэк, сельскіх клубаў і дамоў культуры шырока прапагандуюць матэрыялы гістарычнага лістападаўскага Пленума ЦК КПСС.

У раённай бібліятэцы складзена картатэка па матэрыялах Пленума. У чытальнай зале з'явілася цікавая папка «Чытайце матэрыялы Пленума» з дакладам М. С. Хрушчова і выступленнямі ўдзельнікаў Пленума. Наладжваюцца ў бібліятэцы і гутаркі. Гэтымі днямі актывіст бібліятэкі чытач В. Міхееў правёў гутарку аб зменах, якія адбудуцца ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы рэспублікі ў бліжэйшыя гады.

Новы план работы з улікам гістарычных падзей склалі ў раённым Доме культуры.

АЛОВАК СМЯЕЦЦА КПІЦЬ ГНЕВАЕЦЦА.

У МАЙСТЭРНІ МАСТАКА-АБСТРАКЦЫЯНІСТА

— Яшчэ адзін мазок, мой даражэньні!
Мал. Ул. БАРАНОЎСКАГА.

Пісьменнік і ЧАС

ВЕЧНЫ АГОНЬ ПРАЎДЫ

РОЗДУМ МЕРКАВАННІ ПАЛЕМІКА

Валянцін ТАРАС

«Мне падабаецца наш час вяртання да Кастрычніка», — усклікнуў паэт М. Львоў у вершы, змешчаным на Кастрычніцкія святы ў «Літаратурной газеце». І сапраўды, мы вяртаемся да Кастрычніка, да Леніна, да чыстых вытокаў сацыялістычнай рэвалюцыі, да яе першародных крыніц, што заструменілі з новай сілай пасля таго, як Камуністычная партыя адкінула культ асобы Сталіна. Абавязак літаратуры — шырока і смела адлюстраваць гэты час, услаўляць і сцвярджаць тое новае, светлае і чалавечнае, што ўвайшло ў наша жыццё пасля XX і XXII з'ездаў КПСС. Для яе настала пара гаварыць толькі праўду і ўсю праўду. Вось чаму, услаўляючы новае, яна непазбежна будзе скіроўваць і скіроўвае свой агонь па тых абымшэлых, але ўсё ж яшчэ трывалых «дотах і дзотах», у якіх заселі валаяныя салдацкі Сталіна. Гэтыя «доты і дзоты» не што іншае, як абыякавасць і пагарда да чалавека, дагматычнае мысленне, сістэма казённых фраз, за якой пэўныя людзі хаваюць сваё маральнае банкрутства, сваё няўменне працаваць, сваю чыноўніцкую мёртвую душу. Літаратура павінна ўзрываць гэтыя пункты абароны старога, і самае моцнае яе выбуховае рэчыва—бязлітасная праўда. «...Мы можам і павінны многае высветліць і сказаць праўду партыі і народу. Мы абавязаны зрабіць усё для таго, каб цяпер устанавіць праўду... Гэта трэба зрабіць для таго, каб падобныя з'явы ніколі не паўтарыліся ў будучым», — гаварыў М. С. Хрушчоў у сваім заключным слове на XXII з'ездзе КПСС.

Але я зусім не хачу, каб мяне зразумелі так, быццам я настойваю на аднабаковасці, на тым, каб літаратура займалася толькі выкрывальніцтвам, каб яна страляла толькі ў адным напрамку. Не. Я лічу адной з асноўных і галоўных задач літаратуры выхаванне павагі да чалавека і глыбокага, сардэчнага спачування яму. У гэтай сувязі я і хачу паспрачацца з некаторымі меркаваннямі Барыса Бур'яна, выказанымі ім у артыкуле «На арбіту эпохі».

Барыс Бур'ян таксама заўважыў, што ў сучаснай літаратуры вельмі выразна загучаў матыў спачування чалавеку, але ён прыйшоў да вываду, што гэтае спачуванне «ўсё часцей... выказваецца чалавеку ўвогуле», што «чалавечнасць у звычайным жыццёвым сэнсе... робіцца раптам (?!) этычным прынцыпам мастака», што паводле гэтага прынцыпу той ці іншы мастак лічыць, быццам і «няма... у свеце вінаватых, ёсць толькі пакрыўджаныя». Ён угледзеў, напрыклад, у апавяданнях Янкі Брыля адно толькі спачуванне людзям, якое часам мяжуе з сентыментальнай расчуленасцю. Па сутнасці, аўтар артыкула лічыць спачуванне не актыўнай формай пісьменніцкага ўздзеяння на чытача. Мне ж думаецца, што здольнасць востра спачуваць людзям — зусім нядрэнная і не лішняя для пісьменніка рыса, яна заснавана на павазе да чалавека. І нельга не бачыць, што спачуванне таго ж Брыля свайму герою супрацьстаіць таму погляду на чалавека, паводле якога ён — вінцік, хоць і патрэбны для работы дзяржаўнай машыны, але ўсё ж вінцік, які лёгка замяніць і які ва ўсякім выпадку не абавязкова паважаць.

Гады культу асобы Сталіна — гэта, акрамя ўсяго іншага, гады, калі спачуванне бліжняму вытручвалася і замянялася халоднай рашучасцю ўбачыць і апазнаць ворага ў кожным, на каго пакажуць пальцам агенты Берыя. Безумоўна, і ў гэтыя гады наш народ не страціў ні сваёй дабраты, ні сваёй сардэчнасці, ні сваёй здольнасці спачуваць чужому гору. Ніштo не здолела забіць у народзе і партыі дух ленінскай чалавечнасці. Гэта з велізарнай сілай выявілася ў полымі Вялікай Айчыннай вайны. І ўсё ж атмасфера падаўлення чалавечай асобы, якая тады існавала, не магла не аказаць уздзеяння на кожнага з нас, на літаратуру. Мала бачылі мы сапраўднай павагі да чалавека. І гэта замыкала людзей у сабе, адділяла іх адзін ад аднаго, не давала «мілець да таварыша людскою ласкай». І нездарма А. Твардоўскі ў паэме «За даллю — даль» заўважыў, што цяпер «народ сам да сябе дабрэйшым стаў». У гэтай дабраце народа мы бачым вытокі таго душэўнага спачування людзям, далікатнага, тонкага, мяккага падыходу да чалавека, павагі да яго, якім прасякнуты многія творы сучаснай нашай літаратуры.

Павага да чалавека не ёсць абстрактная катэгорыя абстрактнага гуманізму. Для пацвярджэння гэтай думкі я хачу прывесці невялічкі ўрывак з апавядання цудоўнага французскага пісьменніка-гуманіста Антуана дэ Сент-Экзюперы «Пісьмо заложніку», якое змешчана ў сёлетняй дзесятай кніжцы часопіса «Новый мир». Вось гэты ўрывачак: «...І таталітарная тыранія магла б забяспечыць нашы матэрыяльныя патрэбы. Але мы — не статак, пастаўлены на адкорм... Павага да чалавека!.. Вось пробны камень... Нацыст, які паважае толькі да сябе падобных, на справе прызнае толькі сябе самога. Ён адкідае творчыя супярэчнасці, забівае ўсякую надзею дасягнуць вяршынь і на тысячу год наперад замяняе чалавека робатам у мурашніку... Павага да чалавека!.. Калі павага да чалавека закладзена ў сэрцах людзей, яны здолеюць стварыць нарэшце сацыяльную, палітычную ці эканамічную сістэму, якая зробіць гэтую павагу свяшчэннай».

Наша літаратура запаліла і нясе людзям вечны агонь праўды. Трэба, каб гэты агонь палаў яшчэ ярчэй, каб на ім растаў нарэшце ўвесь лёд мінулага. Трэба растапіць гэтым агнём пласт вечнай душэўнай мерзлаты — абывацельскую абыякавасць да сацыяльнага і палітычнага жыцця, да грамадзянскіх праблем часу. А такая абыякавасць, арганічная няздольнасць абывацеля спачуваць не толькі асобнаму чалавеку, але і ўсяму народу адлюстроўваецца часам у страшныя фармуліроўкі.

Я не хачу і не буду называць тут прозвішча аднаго маладога журналіста. Думаю, што за фразу, якую ён сказаў, яму ўсё-ткі калі-небудзь будзе соромна. Але вось саму гэтую фразу варта прывесці. Нядаўна, у адной з гарачых спрэчак, якая разгарэлася ў ходзе размовы пра барацьбу нашай партыі па ліквідацыі шкодных вынікаў культу асобы, гэты малады чалавек, адстойваючы сваю пазіцыю неўмяшання ў гэтую барацьбу, сказаў: «Мне асабіста культ нічога дрэннага не зрабіў». Я думаю, што гэтая фраза агаліла самы гранічны слой вечнай мерзлаты душы і сэрца. Баязлівасць і абыякавасць да нязгойных крыўд народа сплавіліся ў гэтай фразе ў суцэльны лёдавы шчыт, якім некаторыя людзі прыкрываюць свой страх перад праўдай жыцця. І я думаю, што ў гэтай фразе змешчаны адказ усім тым, хто сумняваецца, ці варта нашай літаратуры звяртаць самую пільную ўвагу на праблематыку, што звязана з барацьбой супраць перажыткаў культу Сталіна.

Але я зноў вяртаюся да спачування чалавеку, да чэхаўскіх адносін да яго, што вабіць мяне як чытача ў творах К. Паустоўскага, С. Антонава, Ю. Казакова, Я. Брыля, В. Быкава, хоць я люблю і іншых, зусім не падобных на іх пісьменнікаў. Я хачу падкрэсліць толькі, што нам неабходна «чэхаўская плынь» у літаратуры. Горкаўскі падыход да чалавека, зразумела, адзін з асноўных для савецкага пісьменніка, палаючае сэрца Данка ніколі не згасне над нашай дарогай у будучыню. Аднак ёсць у кожнага чалавека такія душэўныя куткі, куды не ўвойдзеш з магутным пражэктарам, — патрэбен і ліхтарык. І тут няма ніякага супрацьпастаўлення аднаго другому — крыніцы сілкавання ў дадзеным выпадку і для магуткага пражэктара і для маленькага ліхтарыка адны і тыя ж: жыццё, гарачая любоў і павага да чалавека.

Мне думаецца, што Янка Брыль па самой прыродзе свайго таленту не схільны завіхац-

(Заканчэнне на 2-й стар.)

ВЕЧНЫ АГОНЬ ПРАЎДЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ца каля пражэктарных установак, затое ліхтарык у яго руках падобны на сонечны праменьчык, які самую звычайную жыццёвую з'яву можа паказаць у нейкім нечаканым душэўным святле. Для прыкладу возьмем тое ж самае апавяданне «Зорка на спражцы», якое Барыс Бур'ян асудзіў у сваім артыкуле за няпэўнасць аўтарскай пазіцыі і ўбачыў у ім сентыментальную расчуленасць. Справа ў тым, што герой гэтага апавядання — не той п'яны-ваты дзядзька Лапша, які «тры разы ўрадам адзначаны, а сам лапсаваўся ўшчэнт». Герой апавядання — душа малога Юркі, чыстая, празрыстая, даверлівая. Юрка пабег за дапамогай незнаёмаму дзядзьку, бо дзядзька, сказаўшы, што ў яго стралялі фашысты, лёг на зямлю. Для Юркі ён толькі што з бою. «Там... фашысты дзядзю пакрыўдзілі... Дзядзя харошы, а яны яго кулямі пастралялі! І ён ляжыць...»

Дарослыя толькі ўсміхаюцца на Юркаву ўзрушанасць. Яны ж ведаюць, што дзядзька Лапша проста п'яны, таму і лёг на зямлю. «Усё ясна, — сказаў дзядзя Толя. — ...А ты тут, Юрка, трывогу ўзняў». Але Юрку нічога не ясна. Ён ведае толькі адно, што «дзядзя той харошы. Ён партызан! І ён герой!..»

Не! Не кінуліся дарослыя на дапамогу чалавеку. Ім усё ясна. І мне, чытачу, таксама ясна, што самае горкае — гэта калі мы не ўмеем спачуваць гэтак жа шчыра і непасрэдна, калі не можам, кінуўшы ўсё, бегчы за паратункам для чалавека, як малы Юрка. І доўга яшчэ думаеш аб тым, што ж здарылася з дзядзькам Лапшой, чым пакрыўдзіла яго жыццё, чаму ён «папсаваўся ўшчэнт». І чаму людзі праходзяць міма яго бяды, чаму яны толькі пасмейваюцца, калі ўбачаць яго п'яным, чаму развучыліся яны спачуваць...

Я не бачу ў такой логіцы пісьменніка ніякага «рэмаркізму», не бачу таго, што, як гаворыць Б. Бур'ян, «герой толькі пакутуе і ўсё». (Дарэчы, і ў Рэмарка герой не проста пакутуе. Ён змагаецца за сябе за сваю чалавечую годнасць, ён усімі сіламі імкнецца застацца чалавекам, нягледзячы ні на што. Аднак у Рэмарка ён — ахвяра, таму што жыве ў бесчалавечным свеце, таму што яму ніхто не спачувае).

Зыходзячы са свайго разумення «этычнай формулы спачування» і не лічачы яе актыўнай формай барацьбы за чалавека, Барыс Бур'ян прыходзіць да думкі, што такая пазіцыя пісьменніка не дае яму магчымасці прамо і смела ставіць балючыя пытанні, звязаныя з нашым нядаўнім мінулым, што спачуванне перарастае ў нейкае «надкласавае» пачуццё і тады «...пратэст супраць парушэнняў натуральных норм чалавечых узаемаадносін непрыкметна... пераходзіць у абстрактны, завуаляваны пратэст супраць усялякіх грамадскіх абавязкаў...»

Так, ва ўсякім выпадку, я зразумеў Барыса Бур'яна і мне здаецца, што яго нельга зразумець інакш.

Я згодзен з тым, што пісаць пра тое, што перажыў народ пры Сталіне трэба і прама, так як напісаў А. Салжэніцын, але я лічу, што трэба пакінуць за пісьменнікам права пільна разглядаць і маральна-этычны бок гэтай тэмы. Я не ведаю, дзе Барыс Бур'ян убачыў пратэст супраць грамадскіх абавязкаў і дзе ён убачыў «чалавека ўвогуле». У тых апавяданнях Я. Брыля, аб якіх гаварыў Барыс Бур'ян, абстрактных людзей няма, няма іх і ў апавяданнях Б. Сачанкі, хоць можна пагадзіцца з крытыкам, што характары гераяў Б. Сачанкі часам няпэўныя, неакрэсленыя, а нават і цьмяныя. Аднак я не знайшоў у іх пратэсту супраць грамадскіх абавязкаў, я знайшоў пошукі чалавекам самога сябе, пошукі чалавечай сутнасці, што асабліва відно ў гераяў Я. Брыля.

Хоць я ўвязаўся ў спрэчку па некаторых пытаннях жанра, у якім сам ніколі не працаваў, думаю, што агульныя, выказаныя тут меркаванні і думкі можна аднесці і да паэзіі. Перш за ўсё грамадзянская пазіцыя паэзіі—гэта несупынная атака на ўсё тыя ж пункты абароны, на апошнія акопы дагматыкаў і казённых душ. Баявыя патроны паэзіі нашых дзён — ідзі апошніх партыйных з'ездаў. Іменна гэтым растлумачыла нядаўна «Правда» папулярнасць такіх паэтаў, як Яўген Ёўтушэнка і Раберт Раждэственскі. Пакуль крытыка ламала коп'і вакол паэзіі Ёўтушэнкі і ламала галаву, куды падзець Андрэя Вазнясенскага, яны і цэлы атрад іншых маладых паэтаў уверваліся ў самую гушчу жыцця і мільёны чытачоў пайшлі за імі, а не за перастраховачнай крытыкай.

Пад чырвоным сцягам вясны і маладосці рушылі ў паэзію і нашы, тутэйшыя хлопцы: Рыгор Барадулін, Алесь Наўроцкі, Уладзімір Караткевіч, Васіль Макарэвіч, Ігар Шклярэўскі, Генадзь Бураўкін. Яны таксама сяго-таго напалохалі сваёй няўрымслівасцю, задзірыстасцю, калючай аўглаватасцю. Можна ўспомніць патаемную, але даволі жорсткую баталію вакол кнігі Ігара Шклярэўскага, ратаваць якую ад перастрахоўшчыкаў прыйшлося нават кіраўніцтву Саюза пісьменнікаў. І вось кніга выйшла, і з'явілася на яе добрых паўдзесятка рэцэнзій, і ўсе — станоўчыя. Цяпер смешна ўспамінаць недарэчныя доказы тых, хто сцвярджаў, што яна быццам бы шкодная.

Смешна таму, што па зместу свайму кніга гэтага маладога паэта даволі звычайная, яна не ставіць складаных грамадскіх пытанняў і менавіта ў гэтым яе самы значны недахоп. Аднак гэта свежая кніга, аўтара яе нельга абвінаваціць у сумным апісальніцтве, паэт шукае сваё слова і свае фарбы, свой малюнак верша.

Але не толькі ў грамадзянскай смеласці і навізне формы сіла і папулярнасць сучаснай паэзіі (што датычыць формы, то я асабіста глыбока перакананы ў тым, што і «пушкінскі» і «купалаўскі» верш яшчэ далёка не вычарпалі сябе. Артыкул Рыгора Бярозкіна «Свет Купалы» паказвае, між іншым, якая гэта жахадэмія для паэта — купалаўская паэтыка).

Выключная сіла сучаснай паэзіі ў тым, што яна рашуча адмаўляецца ад апісальніцтва, ад паэтызмаў, што кожны сапраўдны верш — гэта згустак інтэлектуальнай энергіі, паэзія напружанай думкі. Паэзія зрабілася востра-канфліктнай. Толькі вучні і графаманы пішуць цяпер нейтральныя вершыкі пра тое, як «харошы, дужы, любы цалаваў дзяўчыну ў губы».

Што датычыць беларускай паэзіі, дык трэба дадаць яшчэ, што яна зняла нарэшце сялянскую хустку, і ад гэтага твар яе не страціў сваіх нацыянальных рысаў. Знікла толькі праставатасць, наіўная вясковасць яе, даволі смешная на фоне сучасных беларускіх гарадоў, вялікіх заводаў, на фоне атамнага рэактара Акадэміі навук БССР. Гэта тлумачыцца перш за ўсё тым, што новае пакаленне паэтаў адмовілася ехаць на дзедавым кані. Яне зразумела, што змяніўся сам прынцып, сам падыход да мастацкага пазнання рэчаіснасці. Але вось якая супярэчнасць: маладой паэзіі, што вырастае на глебе новай рэчаіснасці, убірае ў сябе яе складанасць, яе паліфанію, даводзіцца пераадольваць такую косную сілу, як шырока распаўсюджаныя прывычныя густы. З гэтай прычыны падстрыжаны пад нуль паэт ідзе па зялёнай вуліцы, а як толькі трапіць у выдавецтва нехта, хто па сёняшняй модзе прычасаны, трэба клікаць на дапамогу самыя важкія аўтарытэты, каб яны ўзялі на сябе смеласць сказаць, што прычоска хоць нейкая і не такая, але хлопец, па ўсяму, відаць наш, савецкі.

Занадта асцярожныя людзі, якія ёсць і ў нашым выдавецтве, не хочуць або не могуць зразумець, што паэзія павінна, як самы чуйны сейсмограф, рэагаваць на самыя глыбінныя жыццёвыя зрухі, ставіць новыя грамадскія, маральныя, этычныя і палітычныя пытанні, выказваць новыя думкі і пачуцці, якія толькі што ўзніклі або ўзнікаюць і якія людзі самі не могуць часта выказаць, вытлумачыць, сфармуляваць, у тым ліку і тыя людзі, ад кого залежыць лёс той ці іншай паэтычнай кнігі. Трэба давяраць паэту як савецкаму грамадзяніну, давяраць яго сумленню, яго адданасці нашаму ладу, справе камунізма. Калі разведчыка пасылаюць на заданне, ніхто не зможа сказаць наперад, што ён сустрэне на сваім шляху, якія абставіны ўзнікнуць і як канкрэтна будзе ён дзейнічаць. Але яму вераць. Вераць у тое, што ён да апошняй кроплі крыві будзе біцца за сваіх. А хіба паэт не ў разведцы? Хіба ён не бачыць тое, чаго пакуль што яшчэ не бачаць астатнія (у тым ліку і самыя разумныя рэдактары). Дык давайце ж не будзем пільнаваць паэта на кожным кроку, калі ён шукае новыя сцежкі.

Праўда, трэба дадаць, што ў тым становішчы, калі людзі, чытачы, недаверліва, дрэнна слухаюць, нават добрых, смелых, цікавых паэтаў, вінаваты самі паэты. Яны мірацца з тым, што ў нас паэзія часта выкарыстоўваецца ў якасці затычкі для кадушкі: на розных вечарах і канферэнцыях паэтаў выпускаюць «пад заслону», калі «кадушка» поўная ўжо дакладамі і садакладамі, калі зала стамілася.

З зайздрасцю слухаеш расказы пра тое, як прымаюць вершы ў Маскве, пра натоўпы людзей на плошчы Маякоўскага, пра тое, як людзі літаральна б'юцца за білет на вечар паэзіі ў МДУ ці ў політэхнічным інстытуце. Што, гэта само зрабілася так? Не!

Паэты самі павінны пайсці ў мінскія вну, у рабочыя клубы, не чакаючы, пакуль нехта наладзіць «чарговае мерапрыемства» і «гарнірам» да яго запланае чытанне вершаў. Трэба самім змагацца за чытача, ператварыць літаратурныя вечары не ў казённыя канцэрты, а ў спрэчкі з густамі той ці іншай аўдыторыі. Я не лічу ерэтычнай тую думку, што чытача яшчэ трэба ўзнімаць да разумення паэзіі, што не паэт павінен прыстасоўвацца да чытача, а наадварот — чытач абавязан дарасці да сапраўднага паэта. Гэтага не здарыцца да той пары, пакуль паэзія будзе «закускай» у канцэртных праграмах, а не асноўнай ежай на эстрадах і сцэнах.

Я адчуваю, што ў мяне атрымаўся занадта публіцыстычны артыкул. Але, перачытаўшы яго, думаю, што сказаў сёе-тое, што мае непасрэднае дачыненне да той размовы, якая пачалася ў «Літаратуры і мастацтве» пад назвай «Пісьменнік і час».

Няхай сабе Рыгор Барадулін і Васіль Макарэвіч шукаюць карнавыя рыфмы, няхай Анатоль Вялюгін дае ўзоры дакладнай, поўнай рыфмы, няхай Аркадзь Куляшоў вяртаецца да строгай формы санета, няхай вучыцца ў Буніна Барыс Сачанка, няхай Алесь Адамовіч непасрэдна ўвасабляе ў творы сваю канцэпцыю рамана — аснова поспехаў і іх, і ўсёй літаратуры ў захаванні вечнага агню праўды. Трэба, каб літаратура адлюстравала «грамадзянскую вайну» тэндэнцый і інтарэсаў, якія бушуюць у сучасным свеце, адлюстравала вострае сутыкненне старога і новага і ў нашым грамадстве. Тады яна дапаможа народу і партыі знайсці найбольш канструктыўнае вырашэнне сучасных праблем і наблізіць прыход таго дня, калі будзе

в каждом окне — по солнцу,
в каждой груди — по сердцу,
в каждой руке — по яблоку,
круглому, как земшар!

ШУКАЙЦЕ ПАЭТЫЧНАЕ Ў БУДЗЁННЫМ

...Гэта былі самыя звычайныя нажы з цяжкімі і даўгімі тронкамі. Хлопцы, крутнуўшыся на месцы, з сілай шпурлялі іх у невысокі дашчаты плоцік. Рабілі яны гэта з вялікім усведамленнем уласнай годнасці.

Міма праходзілі людзі. Адны здзіўлена паглядалі на хлопцаў, другія праходзілі ўнурыўшыся: «гэта нас не датычыцца...» Але вось каля заўзятых «мятальшчыкаў» спыніўся чалавек гадоў пад сорак. Яго адносіны да таго, што ён убачыў, зусім здзівілі мяне. «Бяры правей, блазан!» — прагнявіў ён, а яго азызлы твар засвяціўся амаль што сонечнай ухмылкай. Дзядзька ўсё больш падгараў хлопцаў, якія аж заходзіліся ў намаганні абавязкова пацэліць у шчыкеціну. Ім ужо хацелася дагадзіць гэтаму чалавеку, які звярнуў на іх увагу, стаў сведкам і нават удзельнікам дзіцячай «гульні». Ды ці была яна дзіцячай? Крыўдна за гэтых 14-гадовых хлопцаў, якія знаходзілі ў сваёй наіўнай забаўцы нешта адмысловае, рамантычнае.

Мне ўдалося пагутарыць з тымі хлопцамі — з Артурам і Генікам. Аказваецца, падлеткі незаўбавае праглядзелі амерыканскі баявік «Выдатная сямёрка». Не будзем гаварыць аб гэтым фільме. Аб ім добра сказаў пры сустрэчы з амерыканскімі журналістамі летам гэтага года М. С. Хрушчоў. Але пасля гутаркі з гэтымі мінскімі хлапчукамі мне падумалася аб тым, што мастацтва мае вельмі вялікі маральны аўтарытэт, яно можа пакалечыць душу, але і ўзняць чалавека на вышыню сапраўднай мужнасці, гераізму.

На полі бою ў 1941—44 гадах людзі знаходзілі ў загінуўшых савецкіх салдат сагрэтыя сэрцам мужныя радкі савецкай паэзіі, кнігі М. Шолахава і М. Астроўскага, якія былі захаваны пад простым бушлатам або шынялём, каля сэрца. Вобразы гэтых твораў натхнялі людзей на гераічнае, рашучае, смелае, бо яны авеяны рамантыкай эпохі, велічнага часу. Вось вам станоўчыя прыклады маральнага аўтарытэту мастацтва.

А што мы бачым у прыведзенай вышэй сцэне, які вынік дасць яна, што пасее добрага ў сэрцах двух хлапчукоў? І думаецца: трэба больш кніг сапраўдных, дзейсных, акрылёных. Такімі павінны быць творы для дзяцей.

Гераізацыя спраў савецкага чалавека — адказная задача для пісьменніка. Іменна пісьменнік у мастацкай форме вучыць адрозніваць сапраўдны гераізм ад уяўнага, захапленне здаровае, карыснае ад шкоднага, чужога, наноснага. Вялікую дапамогу ў фарміраванні здаровых эстэтычных густаў нароўні з іншымі жанрамі павінна аказаць прыгодніцкая кніга. Іх у нас яшчэ зусім мала. М. Горкі гаварыў, што прыродзе дзяцей уласціва імкненне да яркага, незвычайнага, гераічнага. Тым больш у прыгодніцкіх творах — тут сустрэнеш і прыўзнятасць, рамантычнасць падзей і ўслаўленне чалавечых мар і спраў.

І павінен дзейнічаць такі герой, каб мог «заразіць» чытача, натхніць яго на нешта добрае і карыснае, толькі не на бачанае мной, апісанае вышэй. Няхай мяне зразумеюць правільна: я не сцвярджаю, што для развіцця эстэтычнага здаровага густу абавязкова трэба чытаць толькі прыгодніцкія кнігі. Я пра тое, каб прыгодніцкі жанр спрыяў выхаванню добрага густу, каб ён натхняў на прыгожыя справы. Колькі сапраўды прыгожага абудзіць у чытача аповесць Я. Маўра «Палескія рабінзоны»! Але што можна пачарпнуць з такіх слабых у мастацкіх адносінах прыгодніцкіх кніг, як «Таямнічы надпіс» В. Зуба, «Каштаны масквіч» Хв. Жычкі, «Пабярэжцы» М. Ваданосава, «Лань — рака ляская» А. Шашкова? Ці стаў хоць адзін герой з гэтых кніг добрым узорам для пераймання?

Мабыць, не варта зусім ганіць гэтыя творы, але ж занадта яны прыземленыя, няма ў іх той рамантычнай узнёсласці, да якой так прагавіты юны чытач. Героі А. Шашкова і М. Ваданосава не надзелены тымі яскравымі рысамі, якія далі б падставу гаварыць аб іх, як аб героях актыўных, сапраўды сучасных.

Мы не збіраліся ўзнімаць у гэтай заметцы нейкія праблемы. Проста хацелася выказацца за тое, каб у цэнтр узаемаадносін гераяў пісьменнікі ставілі падзеі грамадска значныя, выхоўвалі ўменне бачыць незвычайнае ў будзённым, у тым, што ствараецца рукамі савецкага чалавека. Герой мастацкага твора павінен стаяць упоравень з героем нашага часу, і толькі тады ён зможа актыўна ўздзейнічаць на розум і эмоцыі чытача.

Б. ЗУБКОЎСКІ,
настаўнік.

Брасцкая вобласць.

Я люблю цябе, Мінск!

3. І далей крочыць дзень па вуліцах горада...

Вось гэта, так сказаць, невялічкая бытавая сцэнка. Чымсьці крышку нагадвае яна надр з італьянскіх неарэалістычных фільмаў. Выццам дзесьці, на плошчы ў Мілане ці Венецыі сабраліся беспрацоўныя і на фоне чужых шыкоўных аўтамашын ядуць гаворну пра сваё жыццё-быццё. Не хвалюйцеся, мінскім таксістам беспрацоўе не пагражае. Гэта проста так, невялікі час «пік» для шафёраў таксі. Час, калі людзям пакуль што няма куды спяшацца.

Пачанайце да вечара. У тым, што мінскім «таксі» яшчэ вельмі далёка да «беспрацоўнасці», вы можаце пераканацца на ўласным вопыце. Будзеце спяшацца ў тэатр ці на канцэрт — спатрабіцца таксі, і часам днём з агнём яго не зловіце.

ХТО КАМПЛЕКТУЕ СЕЛЬСКУЮ БІБЛІЯТЭКУ?

З кожным годам расце колькасць бібліятэк Магілёўскай вобласці. А яшчэ хутчэй павялічваюцца іх кніжныя фонды. Калі гады тры—чатыры назад у кожнай сельскай бібліятэцы было дзве—чатыры тысячы кніг, то цяпер у сярэднім — шэсць тысяч. Нямала ёсць у вёсках і бібліятэк з кніжнымі фондамі ў 8—10 тысяч тамоў, а многія раённыя бібліятэкі маюць па 25—28 тысяч экземпляраў кніг. Яшчэ багацейшыя гарадскія бібліятэкі: у іх па 40—70 тысяч тамоў разнастайнай літаратуры.

Паляпшаецца становішча і ў калгасных бібліятэках. Напрыклад, сёлета ў Шклоўскім раёне па ўсе семнаццаць калгасных бібліятэк неаднаразова паступалі навінкі палітычнай, мастацкай, сельскагаспадарчай і навукова-папулярнай літаратуры.

Кніжныя фонды выраслі не толькі колькасна, але і якасна. Асабліва гэта датычыцца сельскіх бібліятэк. Бібліятэчны калектар прысылае ім цяпер штомесяц літаратуру па самых разнастайных пытаннях: па тэхніцы, атэізму, а таксама грамадска-палітычную.

Паляпшаюцца справы і з прапагандай кнігі. У большасці бібліятэк вобласці арганізаваны свабодны доступ да кніжных паліц, працуюць калектывы грамадскіх кніганошаў, лепшай стала наглядная агітацыя.

І ўсё ж у рабоце бібліятэк ёсць яшчэ і многа недахопаў. У першую чаргу ў камплектаванні бібліятэчных фондаў.

Работнікі сельскіх бібліятэк амаль цалкам даверыліся бібкалектару і працуюць па прынцыпу: што прышлюць, тое і добра. А ў мясцовых кнігарнях яны купляюць толькі кнігі мастацкай літаратуры, пераважна раманы. Што ж атрымліваецца? На першы погляд, бібкалектар шле многа кніг. Аднак з-пад яго ўвагі чамусьці выпадае сельскагаспадарчая літаратура. Аблкнігагандаль таксама скупіцца на яе. Вось і атрымліваецца, што ў сельскіх бібліятэках па сутнасці няма той літаратуры, якая ім вельмі патрэбна.

Многа хібаў і ў рабоце некаторых раённых бібліятэк. Напрыклад, у Клімавіцкай раённай бібліятэцы на кніжных паліцах — больш дваццаці тысяч тамоў. А многіх навінак не знойдзеш.

Аднойчы ў Клімавічы прыехаў паэт Аляксей Пысін. Бібліятэкары ледзь знайшлі (ды і то ў некага з чытачоў) адзін экземпляр яго зборніка вершаў «Сонечная паводка». Не знайшлося ў бібліятэцы і новых кніг іншых беларускіх пісьменнікаў.

Так здарылася не толькі таму, што работнікі бібліятэкі не імкнуліся папаўняць кніжнага фонду. Раённы аддзел культуры, якому каторы год не шанцуе на пастаяннага загадчыка, дрэнна фінансуе бібліятэку. Сёлета, напрыклад, бібліятэка месяцамі не атрымлівала на кнігі ні рубля. Значную суму грошай, прызначаных на набыццё кніг, райвыканком перадаў іншым арганізацыям.

Выклікае трывогу цяперашняе становішча з кніжнымі фондамі ў большасці клубных бібліятэк вобласці. Работнікі сельскіх клубаў, як правіла, набываюць кнігі ў мясцовых кнігарнях. Прычым адразу на ўсю наяўную суму. Не выпадкова таму ў многіх клубах няма матэрыялаў XXII з'езда КПСС, сакавіцкага Пленума ЦК КПСС, няма літаратуры аб перадавым вопыце ў сельскай гаспадарцы, а таксама многіх твораў мастацкай літаратуры.

Спашлёмся на прыклад Прусенскага клуба Касцюковіцкага раёна. Чытачы бібліятэкі гэтага сельскага клуба толькі сёлета ўпершыню змаглі пазнаёміцца з раманам В. Лаціса «Сын рыбака». А кнігі І. Шамякіна «Трывожнае шчасце» яны яшчэ і не бачылі. Матэрыялы XXII з'езда КПСС у клубе ёсць, але гэта ініцыятыва загадчыка клуба Г. Мурачовай.

А чаму б не сканцэнтраваць 40—50 працэнтаў сродкаў, якія асігнуюцца на кнігі для сельскіх клубаў, у бюджэце раённага аддзела культуры, як гэта зроблена для сельскіх бібліятэк? Вядома, гэта яшчэ не выхад са становішча, але камплектаванне клубных бібліятэк рабілася б значна лепш.

У многіх бібліятэках мала яшчэ звяртаюць увагі на запатрабаванні чытачоў, дрэнна выкарыстоўваюць дублетную літаратуру, абыякава адносяцца да кніжнага багацця, не ўсюды ёсць яшчэ аб'яднанні кніганошаў.

Аб усім гэтым гаварылася на трохдзённым семінары работнікаў бібліятэк вобласці. Удзельнікі семінара праслухалі даклады дырэктара абласной бібліятэкі імя Ул. І. Леніна Н. Саўчанні, загадчыка абласнога бібліятэчнага калектара В. Чайкоўскага, загадчыка Слаўгарадскай раённай бібліятэкі Г. Дзюндзікавай, бібліятэкара Крычаўскай раённай бібліятэкі Н. Чыгіловай, загадчыка Бабруйскай гарадской бібліятэкі імя А. Пушкіна В. Зорынай і іншых, якія абмяняліся вопытам работы па камплектаванню кніжных фондаў.

Прысутныя на семінары пазнаёміліся з работай абласнога бібкалектара, з навінкамі літаратуры, заказалі патрэбныя кнігі. Разам з членамі савета бібкалектара яны абмеркавалі планы выдавецтваў на 1963 год. Акрамя гэтага, удзельнікі семінара наведалі кнігарні горада, бібліятэкі, прысутнічалі на літаратурных і тэматычных вечарах.

Такія семінары мяркуецца правесці ў пачатку будучага года ва ўсіх раёнах вобласці.

В. АРЦЕМ'ЕЎ.

Экскурсія ў Ленінград

Група работнікаў масавых бібліятэк Мінска наведала Ленінград і пазнаёмілася з работай бібліятэк горада. Беларускія культасветработнікі пабывалі ў Цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя Маякоўскага, бібліятэцы Ленгарвыканкома, масавай бібліятэцы Дзяржынскага раёна.

Л. ФРЫД.

ТЭАТР

КАБ ІНШЫХ НАВУЧЫЦЬ...

Георгій КОЛАС

У адным з пісем Поля Элюара ёсць фраза: «Навучыся разумець тое, што ты чытаеш, каб навучыць таму ж і іншых».

Словы гэтыя, як мне здаецца, вельмі датычаць тэатра. Яго майстры — рэжысёры, артысты, афарміцелі — павінны перш за ўсё навучыцца самі як след разумець узятую да пастаноўкі п'есу, каб потым навучыць і гледачоў разумець яе па-сапраўднаму: значна глыбей, усебакова, эмацыянальна. Інакш навошта патрэбен тэатр? Хіба толькі, каб узнавіць літаратурны твор у жывых асобах?..

У Магілёўскім тэатры паставілі «Такое каханне» чэхаславацкага драматурга Паўла Кагоута. П'еса разумная, тонкая. Яна абышла шмат тэатраў нашай краіны. А зараз пачаўся «другі тур» у яе сцэнічнай біяграфіі — хто не паставіў раней, ставіць цяпер: статыстыка збораў паказала, што дарэмна яны абмінулі яе.

Статыстыка ў мастацтве мае свае асаблівасці. Успрынятая павярхоўна, яна можа часам стварыць уражанне, што твор, які карыстаецца поспехам, «самаігральны»: пакладзі яго на суфлёрскую будку, і ён загучыць, і поспех тэатру забяспечан. Так з п'есай Кагоута неаднойчы здаралася. Атрымоўвалася... ды, шчыра кажучы, нічога з таго не атрымоўвалася. Тэатры з расчараваннем здымалі спектакль з афішы.

У Магілёве п'есу не клалі на «суфлёрскую будку». Рэжысёр Марк Генін даў ёй сваё «прачытанне». А спектакль — хоць ты здымай яго з афішы — не карыстаецца поспехам.

Той-сёй у тэатры спрабаваў вінаваціць публіку. Маўляў, гэта вельмі складана, глядач не дарос.

Як быць? Дарошчваць, выхоўваць? Павесці растлумачальную работу? Але ў тэатры ведаюць — калі глядач неўзлюбіў пастаноўку, дык колькі яму ні тлумач, колькі ні праводзь сустрэч і канферэнцый, нічога не атрымаецца.

Дык што ж адбылося з «Такім каханнем» у Магілёве?

Адбылося самае прыкрае: тэатр (у першую чаргу рэжысёр) не зразумеў п'есу. Марк Генін, хацеў ён таго ці не, надаў ёй самую непажаданую трактоўку.

Вядома, што Кагоута папракалі ў фрэйдысцкім уплыве: нібыта лёс яго гераіні Ліды Мацісавай вырашае канфлікт «лібідо» — непрымірымая супярэчнасць двух пачаткаў у асобе чалавека — свядомасці і падсвядомага інстынкту.

На першы погляд, у п'есе маюцца немалыя падставы так трактаваць яе. І, заўважым, фільм, зроблены па п'есе на радзіме Кагоута, меў менавіта такое гучанне. На нашых экранах ён не прыжыўся, прайшоў непрыкметна. А п'еса — жыла і жыве.

Лепшыя пастаноўкі (перш за ўсё у Гродзенскім тэатры і таксама ў Маскоўскім імя К. С. Станіслаўскага) вабілі гледача, як актыўны мастацкі пошук у распрацоўцы надзённых грамадзянскіх пытанняў. І тое, што п'еса з'явілася на свет пасля XX з'езда КПСС, вызначала пазіцыю гэтых тэатраў да яе. Праз яе тэатры таварылі аб неабходнасці беражлівага, уважлівага стаўлення да чалавека. А праблемы маралі вырашаліся ў плане марксавай думкі аб тым, што грамадства будучыні выпрацуе сваю, новую, ні на што папярэдняе не падобную, вольную мараль. Пры чым жа тут і фрэйдызм, і «лібідо»?

У спектаклі Магілёўскага тэатра пануе гвалтоўная тэма лёсу.

Значную ролю адыгрывае тут музыка. Л. Караганаў абраў для музычнага афармлення Пятую сімфонію Бетховена, з выкарыстаннем адной толькі тэмы, зрабіўшы яе лейтматывам спектакля: ва ўсіх найбольш вострых, паваротных момантах гучыць бетховенскае «Хто гэта там? — а, гэта лёс!»

Тое ж робіць рэжысёр і ў дачыненні амаль да ўсіх рэтраспекцыйных сцэн п'есы. У Кагоута яны існуюць для таго, каб даць магчымасць і героям і нам, гледачам, больш пільна прасачыць абставіны, матывы і вынікі чалавечых учынкаў. У спектаклі ж яны гучаць як пацвярджэнне таму, што інакш адбыцца нішто не магло: зноў такі гэта — лёс!

Рэжысёр паслядоўны ў сваім заблуджэнні да смешнай наіўнасці: нават вагон, пляцоўка якога стала для Ліды Мацісавай апошняй жыццёвай пляцоўкай, пранумараваны ў спектаклі «злавеснаю» лічбай — 13.

Што ж гаварыць пра акцёраў, якія трапілі ў клешчы гэтай наскрозь ілжывай канцэпцыі?

Можна толькі паспачуваць выканаўцы цэнтральнай ролі В. Кабатнікавай. Там-сям яна спрабуе прыўзняцца над змрочнай асуджанасцю, але яе намаганні патанаюць у акордах музыкі, ва ўсёй атмасферы спектакля.

У Кагоута людзі, з якімі перакрыжаваўся лёс Ліды, — складаныя, значныя натуры. А на магілёўскай сцэне — дробязь. Пётр Петрус (А. Рудакоў) — дробны перастрахоўшчык. Мілан Сцібар (В. Егуноў) — маленькі эгаіст. Маці Сцібара (Ю. Гальперына) — проста мяшчанка, нават з прыкметамі мяшчанства даўно мінулых гадоў. Бадай, толькі Лідзе Петрусавай трошкі пашанцавала — З. Малчанава захавала ў гэтай ролі яе драматычную строгасць, маштаб (хоць і тут ёсць пагроза прымітыўнай «выкрывальнасці», не-не, ды і прадэманструе актрыса нейкі антарктычны холад душы гераіні).

Зусім не знойдзена ў спектаклі месца Тошака (С. Яворскі) і Майкі Грабетавай (Р. Сакалова). І толькі адзіная роля — Чалавек у мантыі ў выкананні М. Радзіёнава атрымала тут, хоць і паасобнае, аднак цікавае, моцнае, свежае вырашэнне. М. Радзіёнаў усёю сваёй істотай паўстае супраць бесчалавечнасці, антыгуманнасці. Ён вядзе суд сумлення на вялікім публіцыстычным пафасе. Але... супраць каго гэты пафас? Супраць лёсу?

У Кагоута не лёс, а людзі, накшталт Тошака і Майкі Грабетавай, — галоўныя вінаўнікі трагічных падзей. Гэта на іх «устаноўкі» азіраліся, вымушаны былі азірацца героі. Пра іх можна выказацца эпіграфам да рамана Бруно Ясенскага «Змова раўнадушных»: з іх маўклівай згоды існуюць на свеце здрада і вабойства. А на магілёўскай сцэне ў здрадзе каханню, у забойстве кахання абвінавацілі лёс... А глядач, дзякуй яму за тое,—не згадзіўся з такім прысудам і вынес спектаклю свой маўклівы прысуд...

Глядач нават з большай прыхільнасцю сустрэў меладраму

Я люблю цябе, Мінск!

2. Горад жыве, дыхае, працуе. Горад абслугоўвае пакупніноў, развозіць пасажыраў, дае старт аэралайнерам, друкуе кнігі, варыць сталь. Мінск-працаўнік правёў праз свае цудоўныя вуліцы і плошчы чалавека з фотаапаратам вось сюды, у сталеліцейны цэх нашай сучаснай нацыянальнай гордасці — Мінскага аўтамабільнага завода.

Сталеліцейны цэх... Калі б раптам аднойчы тут апынуліся разам людзі самых разнастайных прафесій і творчых дыяпазонаў, то тут, перад гэтым цудам, усе яны праніклі б аднолькавым пачуццём. Сталь ідзе! Вогненны дракон глыбока ўражвае, але і чалавек, што стаіць побач з мартэнаўскай печчу, ніколі не будзе здавацца маленькім і непрыкметным. Бо гэта ён тут — цэнтр усяго, ён — сіла думкі, волі, энергіі.

І нічога, што фотааб'ектыў не наблізіўся да твару сталевара Андрэя Мініча, не перадаў яго буйным планам. Што выказвае твар чалавека ў такую хвіліну, поўнасцю можа падказаць вам уласнае ўяўленне...

Спытай у кнігі

ДАР СЭРЦА ПАЭТА

Я — кропля.
Кропля я ў бязмежным акіяне.
Я—парушынка,
трапіўшая ў цуд.
Хай плён маіх турбот
на гэтым свеце стане
Часцінкаю
і шчасця
і пакут.

Гэтыя радкі ўзяты са зборніка лірэйскага паэта Айзіка Платнера «Дар сэрца», які нядаўна выйшаў у Дзяржаўным выдавецтве БССР. У зборнік увайшлі вершы, напісаныя ў апошнія гады жыцця паэта. Тэматыка іх разнастайная. Аўтар апявае маладосць савецкай зямлі, творчую працу нашага народа. Цёпла і шчыра піша паэт для дзяцей.

ТАЯМНІЦЫ ЖЫВОГА КУТКА

Сваю першую кніжку «Жывы куток» М. Корзун адрасаваў дзецям малодшага ўзросту. Без дыдактыкі, у жывой, даходлівай форме, вядзе аўтар размову з юнымі сябрамі. І ў гэтым — каштоўнасць кнігі.

Дастаткова пазнаёміцца з першым апавяданнем, як захочацца прачытаць усю кніжку. Усё, аб чым піша аўтар, выклікае цікавасць. Самыя простыя, на першы погляд, з'явы захапляюць чытача, самае звычайнае становіцца ў кнізе незвычайным.

У аснове апавядання «Шапка», якім адкрываецца кніжка, зусім нескладаны выпадак. Віця згубіў шапку на лузе і не знайшоў яе, а праз некалькі дзён выпадкова там жа, «між кустоў у яміцы», убачыў у ёй гняздо з яйкамі кнігаўкі. Віця і яго сябра Лёня пазнаму адносяцца да птушак. Лёня хоча забраць яйкі. Віця настойліва прапануе не рабіць гэтага:

— Эх ты, невук. А яшчэ ў школу ходзіш. Гэта ж карысная птушка. А калі забярэш яйка або хоць дакранешся да яго рукою, яна адцураецца гняздо. А як адцураецца, то лічы, што і сама прапала.

— Чаму?

— Кажуць, што калі птушка не выведзе птушанят, дык другія птушкі не возьмуць яе з сабой у вырай. Яна застанецца тут на зіму і загіне...

Віця ўрэшце пераконвае Лёню не чапаць яйкі. Кнігаўка выводзіць птушанят і пакідае гняздо, а сяброўства Лёні і Віці становіцца больш моцным.

З апавядання «Знаходка» дзеці даведаюцца, што нават і ўзімку ў лесе можна пажаштаваць духмяных і смачных, як мёд, яблыкаў, трэба толькі не валенавацца ды быць кемлівым. Такія апавяданні, як «Загадкавае месца» і «Міколаў барометр», безумоўна, выклікаюць у дзяцей жаданне зрабіць адкрыццё, як гэта зрабіў Віця, або назіраць за прыродай па прыкладу Міколы, які даведваўся аднойчы, што ніцая вярба з'яўляецца дакладным барометрам.

Апісваючы з'явы прыроды, аўтар знаходзіць выразныя выяўленчыя сродкі, трапныя параўнанні.

Гаворачы аб усім добрым, чым вызначаюцца апавяданні, нельга прайсці і міма недахопаў. Вядома, што ў дзяцей малодшага ўзросту мысленне вельмі канкрэтнае. Таму трэба пісаць так, каб яны беспамылкова ўяўлялі тое, пра што чытаюць.

Аўтар жа параўноўвае, напрыклад, сонца з гарбузом: «...быццам вялікі гарбуз...». А які гарбуз: рабы, паласаты, жоўты, а можа цёмна-сіні? Нам, дарослым, зразумела і без эпітета, што хоча сказаць аўтар. Але ж справа ідзе аб дзецях, прычым малодшага ўзросту.

Або такі сказ: «Мы зайшлі ў пакой і за сталом убачылі самога вгранома Івана Іванаіча». З апавядання зусім не вядома, чаму аўтару спатрэбілася слова самога? Што ён хацеў падкрэсліць гэтым словам?

Першая кніжка М. Корзуна — добры падарунак юным чытачам. Яна сведчыць, што аўтар яе любіць дзяцей, ведае іх псіхалогію, добра адчувае мову.

І. СЫМОНКІН.

У Вучэбна-педагагічным выдавецтве БССР выйшла другім выданнем кніга Сцяпана Александровіча «Незабыўнымі сцежкамі». Гэта зборнік праязнаўчых нарысаў пра мясціны, звязаныя з жыццём і творчасцю выдатных беларускіх пісьменнікаў Ф. Багушэвіча, М. Багдановіча, Я. Купалы, Я. Коласа, Зм. Бядулі, Ц. Гартнага, К. Чорнага. Кніга багата ілюстравана.

Вокладка аповесці Уладзіміра Шахаўца «Чорны снег». У аснове аповесці — гісторыя пра адважнага партызана-разведчыка, пра яго подзвіг. Афармляў і ілюстраваў кнігу мастак Ю. Пучынскі.

ТВОРЫ СТУДЭНТАЎ

Некалькі гадоў таму назад быў выдадзены зборнік маладых паэтаў — студэнтаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна. Называўся ён — «Падарунак». І вось сіламі гуртка беларускай літаратуры падрыхтаваны другі зборнік з паэтычнай назвай «Вясновая руна», «Гэта кніжка — новы падарунак студэнтаў, які яны скромна складаюць да ўрачыстай даты серакагоддзя роднага ім універсітэта, які носіць імя дарагога Ільіча» — так піша ў прадмове да альманаха выкладчык універсітэта паэт Алег Лойка.

У зборніку змешчаны творы В. Макарэвіча, М. Маляўкі, Ул. Паўлава, Ул. Верамейчыка, А. Дзімітрыева, М. Зарэмбы, А. Сербантовіча, А. Бяржынскага, А. Кудраўцава, М. Капыловіча, В. Рагойшы, М. Міцкевіча, М. Шаўчэнкі, М. Вышынскага і іншых.

М. БАНДАРЭНКА,
студэнт БДУ.

ВЕРНАСЦЬ І МУЖНАСЦЬ

Нельга без хвалявання чытаць гэтую дакументальную аповесць. Яна ўваскрашае яшчэ адну старонку гераічнай барацьбы нашага народа супраць фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

...Невялікае мястэчка Астрашыцкі Гарадок недалёка ад Мінска. Тут у гады вайны пад кіраўніцтвам настаўнікаў Ларысы Лявонцьеўны Кароткай, Марыі Цярэнцьеўны Цярэшчанка, Паўла Іванавіча Шырынскага помсцяць ворагу за кроў, слёзы і пакуты свайго народа юныя барацьбіты — піянеры і камсамольцы мясцовай школы.

Ліда Матусевіч, Ніна Стасуй, Люба Врубель, Тоня Стэфаковіч, Коля Бароўскі, Паўлік Бацяноўскі, Аркаша Кручонак, Толя Кірасаў і многія, многія іх сябры збіраюць зброю на палях былых баёў, выпускаюць лістоўкі, расказваюць насельніцтву праўду аб становішчы на франтах, ходзяць у разведку, узрываюць лесазавод, перапраўляюць савецкіх людзей да партызан, знішчаюць фашыстаў.

Натхнялі юных мсціўцаў на барацьбу з ненавісным ворагам камуністы — Трафім Качан (Кірыльчанка) і безымянны ўпаўнаважаны, якога вайна застала ў мястэчку, — мужныя, адданыя справе партыі людзі.

Больш ста юных змагароў і іх старэйшых таварышаў-настаўнікаў былі расстраляны гітлераўцамі, па-зверску закатаваны ў фашысцкіх засценках. Ніхто з іх не аказаўся баязліўцам ці здраднікам. Яны мужна сустрэлі смерць, да канца верачы ў непераможнасць нашага народа, у справядлівасць ідэй роднай партыі.

Есць у аповесці і недахопы (некаторыя вобразы атрымаліся залішне фрагментарныя, мова твора часамі сухаватая, здараецца, аўтар падмяняе паказ пераказам), але кніга ўсё ж па-сапраўднаму хвалюе і ўзрушае...

Прачытай, таварыш, гэтую аповесць. Яна вучыць мужнасці, гераізму, вернасці радзіме і партыі.

К. ПЯТКОЎ.

Ольга Сімонава. «Мы будзем жыць». Аповесць. На рускай мове. Дзяржаўнае выдавецтва БССР, Мінск, 1962.

ПАВУЧАЛЬНЫ ВОПЫТ

На розных творчых нарадах, сходах, канферэнцыях у нас многа гавораць пра тое, што даўно настаў час стварыць грунтоўную гісторыю беларускага нацыянальнага мастацтва. Гавораць, вядома, не без падстаў.

Праўда, у апошні час сёе-тое робіцца ў гэтым кірунку, але гэтага вельмі мала. Асабліва, калі мець на ўвазе беларускі музычны тэатр. А між тым, наш Тэатр оперы і балета амаль за трыццаць гадоў свайго жыцця стварыў нямала выдатных пастановак як па творах рускіх і зарубежных класікаў, так і па творах беларускіх кампазітараў. У калектыве тэатра вырасла цэлая плеяда таленавітых майстроў сцэны. Словам, гаворка пра ўсё гэта можа быць вялікая і шчырая.

Добрым прыкладам у гэтым сэнсе можа для нас быць нядаўна выдадзеная ў Ташкенце кніга А. Корсакавай «Узбекскі оперны тэатр». Кніга выдадзена памерам у сорак друкаваных аркушаў, выдатна афармлена паліграфістамі. А вось выдаўцы нашай рэспублікі чамусьці лічаць, што можна абмежавацца толькі выпускам папулярных брашур па гісторыі тэатра і аб творчасці найбольш выдатных дзеячоў беларускай сцэны. Слоў няма, і такія кніжкі могуць прыносіць чытачам пэўную карысць. Але зводзіць усё да выдання брашур значыць не дбаць пра развіццё нашай мастацтвазнаўчай навукі.

У кнізе А. Корсакавай «Узбекскі оперны тэатр» ідзе вельмі шырокая і грунтоўная размова пра оперныя творы. Аўтар глыбока аналізуе як удачы кампазітараў, лібрэтыстаў, акцёраў, рэжысёраў, так і асобныя недахопы іх работы.

Дарэчы, цікава адзначыць і той факт, што ў час Вялікай Айчыннай вайны а Узбекскім оперным тэатрам супрацоўнічаў беларускі кампазітар А. Клумаў. Ён з'яўляецца саўтарам оперы «Меч Узбекістана», пра якую ў кнізе ідзе шырокая размова.

На нашу думку, з працай «Узбекскі оперны тэатр» з цікавасцю пазнаёмяцца не толькі чытачы Узбекістана. Яна выходзіць далёка за межы адной рэспублікі па шырыні погляду на творы опернага мастацтва, па глыбіні і тонкасці іх аналізу.

Мы не збіраемся рэцэнзаваць працу А. Корсакавай. У гэтай нататцы мы толькі хацелі звярнуцца да даследчыкаў і асабліва да работнікаў нашых выдавецтваў: час пераняць добры прыклад, скарыстаць павучальны вопыт кнігі А. Корсакавай «Узбекскі оперны тэатр».

Б. СМОЛЬСКІ.

ВІЛЬНЮСКІЯ ЧАРАДЗЕІ

Аматарам цыркавога мастацтва беларускай сталіцы шанцуе на гасцей у гэтым сезоне. Спачатку яны пазнаёміліся з працаю італьянскіх майстроў. На змену ім з Польскай Народнай Рэспублікі прыехаў цырк «Варшава». А сёння арэна Мінскага цырка — у распараджэнні нашых суседзяў, літоўскіх цыркавых чарадзеяў.

Цырк «Вільнюс» вельмі малады. Кажуць, яму ўсяго толькі тры гады. Але мы ведаем: яго майстры пакарылі ўжо сэрцы гледачоў многіх гарадоў нашай краіны. Не выключэнне і мінчане. Дружныя апладысменты, якімі яны ўзнагароджваюць выканаўцаў самых розных нумароў, сведчаць пра тое, што мастацтва дарагіх суседзяў прыйшлося ім да спадобы.

У пралогу адна з артыстак гаворыць: хай сабе сціплы рапарт наш, ды ён ідзе ад усёй душы. Сказана гэта, вядома, не таму, што прадстаўленню нашых сяброў і на самай справе не хапае нечага значнага. Не, у ім шмат цудоўных нумароў, якія маглі б упрыгожыць любую цыркавую праграму. Больш таго, шчырасць, з якой працуюць артысты, цёплае душэўнае пачуццё, якое добрым рэхам адгукаецца ў сэрцах гледачоў, найлепшым чынам характарызуюць гэта прадстаўленне.

Праграму пачынаюць велафігурысткі заслужаныя артысткі Літоўскай ССР Я. і В. Станкутэ. Цяжка прыгадаць больш дасканалых майстроў гэтага жанра. Аднак сутнасць справы не ў гэтым. У рабоце літоўскіх велафігурыстак вабіць вялікая непасрэднасць. Які б ні быў складаны той ці іншы трук, закончыўшы яго, артысткі ўсміхаюцца. І ўсмешкі гэтыя гавораць: бачыце, як усё, аказваецца, лёгка і проста! Гледачы, вядома, ведаюць, чаго каштавала і каштуе артысткам гэтая лёгкасць. І — задаволены тым больш.

На манежы — заслужаны артыст Літоўскай ССР Гінейка і артыстка Гінейкене. Баланс на катушках! Гэта вельмі цяжкі і складаны нумар. Нам давялося бачыць вельмі віртуозных майстроў гэтага жанра. Але ў літоўскіх артыстаў — свая вартасць: яны працуюць у пары. Як, — могуць запытаць знаўцы цырка, — баланс на катушках і ў пары? Уявіце сабе! Вось адзін з трукаў: катушка, піраміда, а на ёй — артыст Гінейка... Пачакайце, гэта яшчэ не ўсё! Здзіўляючае «збудаванне» вянчае партнёрка ў «капштэйне» — так называюць свабодную стойку на галаве... Ну як?! Нічога не скажаш, майстэрства. Майстэрства, здзіўляючае да неверагоднасці.

Таксама захапляе і нумар «Эквілібрысты з шастамі», які выконваюць заслужаны артыст Літоўскай ССР Раманаускене і артыстка Папірас. Памятаеце горкаўскага гарэзу Ваську Буслаева, які марыў упрыгожыць дзіўнымі гарадамі ды садамі цудоўнымі Зямлю і пусціць яе ў нябёсы ізумрудам дарагім? Нешта падобнае атрымліваецца і ў эквілібрыстаў з шастамі. Палёт іх фантазіі бязмежны, а выключнае майстэрства стаіць недзе побач з вялікай гарэзлівасцю талентаў, для якіх няма ў творчасці немагчымага.

Чытач, напэўна, звярнуў увагу на тое, што ў калектыве Літоўскага цырка шмат заслужаных артыстаў. І трэба сказаць, што яны з вартасцю апраўдваюць гэта высокае званне. Мы не можам не ўпамянуць тут імя яшчэ аднаго з іх — І. Раманаўскаса. Артыст працуе з гірамі, штангамі, ядрамі. Гіры ў яго, як цацкі. Штанга «змей» віецца вакол цела. Ядры градам сыплюцца з «прашчы» на патыліцу. А яму ўсё ні на чым. Гледзячы на Раманаўскаса, міжволі думаеш: да чаго ж прывабным і прыгожым робіць чалавека сіла, спрыт, самаадданасць.

Вышэй гаворка ішла, так сказаць, пра масцітых. Ну, а што ж тыя, хто пакуль яшчэ не ўдастоіўся звання? Кожны па-свойму таксама харошы. Выдатна, напрыклад, працуе паветраная гімнастка Р. Калужвічутэ. Цікавы нумар у жанглёраў на лесвіцах (дадамо — на свабодных лесвіцах) В. і З. Чарняўскіх. Несумненна, таленавіты музычны эксцэнтрык В. Владуліс. Нам здаецца толькі, што некалькі ненатуральны ў яго пераход ад камічнага да сур'ёзнага, віртознага: комік у артыста праставаты, ён павінен быць больш «разумны», — тады і віртуоз стане яшчэ больш значны.

Акрабаты-эксцэнтрыкі Сцяпанавы яўна валодаюць майстэрствам свайго жанра, але было б куды лепш, калі б яны ішлі па шляху пошукаў новага, а не капіравалі, няхай нават вельмі памайстэрску, сваіх папярэднікаў акрабатаў-каскадзёраў. Аднак, не будзем скрупулёзна шукаць недахопы ў тых ці іншых нумарах. Цырк «Вільнюс» малады, і мы ўпэўнены, што ён яшчэ дакажа сваё.

У праграме літоўскіх сяброў немалое месца займае дрэсіроўка. Прыгожыя сабачкі А. Латыцы. З яе меркаванняў выходзіць, што Волі неадкладна трэба кідаць заняткі па музыцы, інакш...

А што было б інакш? Дзяўчынка праз некалькі месяцаў скончыла б музычную дзесяцігодку і потым знайшла б сваё сапраўднае прызванне (у кансерваторыю яе, калі верыць Галіне, ніхто б не прыняў).

Дык навошта было заўчасна ўзнімаць перапалох?

Мы гэтага не ведаем. А аўтар — ведае. Ён ведае, што Галя выйдзе за Волінага брата, а там патрэбна будзе прычына для абвастрэння сітуацыі, вось ён і сварыць Галю і Волю. Гэтая сварка канчаецца тым, што Галя без памяці выскоквае з дому і трапляе... пад машыну.

Тут пачынаецца ўжо «грамадзянскі» матыў Іван Батурын, муж Галі, за тое, каб лячыць яе. А яго бацька, загадчык паліклінікі, супраць, бо лячэнне — рызыкоўнае.

Мукі Галіны (яна вельмі няшчасная: выхоўвалася ў дзіцячым доме потым — п'яніцамуж, потым — гэтая катастрофа і глухата, — разумеецца, што такое глухата для музыканта!), чуллівы акампанемент, охі ды ахі навокал.

— Здымі ты ў мяне камень з душы, — просіць свякруха ў Галі.

А Іван яе лечыць... употай ад усіх. А потым яму дапамагае сястра (яна стала сястрой і па службе, кінула музыку, робіць уколы... зноў-такі пад акампанемент Першага канцэрта Чайкоўскага).

Словам, на сцэне — меладрама. Што ад чаго ў ёй і што да чаго — цяжка зразумець. Напэўна, і тэатр (пастаноўка В. Шутава) не вельмі разумее, у імя чаго ён паставіў п'есу. Каб паказытаць слабыя нервы? Выклікаць жаль?

Пераказваючы змест п'есы, я ніяк не збіраўся яе парадзіраваць. Мне проста яшчэ раз шчыра хацелася ўцяміць, што «зразумеў» тут аўтар, што «зразумеў» тэатр і што яны хочуць навучыць разумець гледача.

Людзі на сцэне пакутуюць, стогнуць, сумуюць, злуюцца, сварацца. Потым, нібы перад Вялікаднем даруюць грахі адно аднаму і, памірыўшыся, «блаженно» ўсміхаюцца.

Вобразаў няма. Ёсць калейдаскоп нематываваных учынкаў. У гэтым калейдаскопе не можа разабрацца нават такі праніклівы майстар сцэны, як М. Радзіёнаў. Яго Батурын-старэйшы выглядае то неўрасценікам, то мудрым дзячком, то звягай, то мешчанінам. Тое ж адбываецца і з Е. Кашынай (яго жонка). Артыст Ю. Труханаў (Батурын-малодшы) трымаецца толькі на ўласнай артыстычнай прывабнасці. Б. Дружноў (Міця) з яўнай пагардай вымаўляе неарганічныя ў ролі маналогі аб паездцы ў Сібір. І толькі выканаўца ролі Галіны Е. Сакурава з усёй самаадданасцю паверыла меладраме і напластавала на тэкст тлусты слой меладраматычных прыёмаў ігры.

Дзіўнае ўражанне засталося ў мяне ад гэтага спектакля. Я прыслухоўваўся да рэакцыі гледачоў навокал. Адны з іх успрымалі п'есу цалкам: пакутвалі разам з Галінай — Сакуравай, міла радаваліся яе «выноснівасці» і з захапленнем апладіравалі фіналу, Іншыя недаўменна пераводзілі погляд са сцэны на суседзяў. Трэція пагардліва, з крыўдай уставалі і моўчкі пакідалі залу.

Такі ён, гэты жанр — меладрама. Ён вабіць многіх, але задавальне толькі тых, хто любіць проста «глядзець» і не хоча «чытаць» — думаць, шукаць адказы.

Ёсць у рэпертуары тэатра і «чыстая» камедыя-вадэвіль «У сябе ў палоне» М. Смірновай і М. Крайндэль у пастаноўцы рэжысёра А. Раеўскага. Шчыра кажучы, гэта быў лепшы з трох спектакляў, якімі магіляўчане адкрывалі сезон. Ён падкупляе шчырасцю, весялосцю, непрымусовасцю апавядання.

Светлая думка, закладзеная ў п'есе, — чалавек павінен заўсёды быць тым, што ён ёсць, — у спектаклі выяўлена праз магчымасці жанра і «чытаецца» лёгка, пад смех і воплескі апладысментаў.

У адрозненне ад іншых пастановак, тут маладыя ролі выконваюць маладыя артысты, і гэта таксама выгадна вылучае спектакль. Праўда, часам М. Веражны ў ролі Барыса Гарэлава злоўжывае трукацтвам, Э. Копычава (Маша Клімава) не ва ўсім адчувае свабоду сцэнічных паводзін, у Л. Закашанскага (Віця Белкін) ёсць некаторая сухаватасць. Аднак усё гэта, будзем спадзявацца, пры адпаведнай рэжысёрскай карэкціроўцы і «абкатцы» спектакля на гледачы выправіцца. Аснова яго — здаровая. Тут ёсць і бездакорныя выканаўчыя работы: З. Малчанава — Вера Андрэўна, Ю. Труханаў — Павел Рыгоравіч. Прыемнае ўражанне пакідаюць таксама В. Суднікава (Таня Валнухіна) і Н. Фядзяева (калгасніца Каця). Адзіны вобраз, які пакуль што выпадае з жанра і атмасферы спектакля, — пенсіянер Цюрын (арт. А. Яфрэменка). Ён занадта загратэскаваны. Аднак у цэлым пастаноўка «У сябе ў палоне» пераканала нас у тым, што камедыю тэатр умее ставіць і ўмее яе іграць.

Зусім нядаўна на сцэне тэатра з'явілася новая, чацвёртая ў гэтым сезоне, прэм'ера — «Дзень нараджэння Тэрэзы» па п'есе Георгія Мдзівані. Гэты твор не вызначаецца высокімі якасцямі драматургіі, глыбінёй псіхалагічных вырашэнняў. Гэта — п'еса-заклік, п'еса-плакат. Так яе і «прачытаў» новы галоўны рэжысёр тэатра А. Асанін. Спектакль ідзе ў дакладным, зладжаным рытме, з напружанай драматычнасцю. Большасць вобразаў характарызуецца адным-двума яркімі штрыхамі: высакародны і непахісны Марсела (А. Руданоў) і злачынны хамелён Апалоніо (М. Бярозкін), рамантычны Хасэ (М. Веражны) і палкі Антоніо (А. Шытава). Сярод патрыётаў і здраднікаў — нібы палахлівыя пінгвіны аптэкар Карлас (С. Бульчык) і яго жонка Эльвіра (Ю. Гальперына).

Больш падрабязна, з некаторым паглыбленнем у псіхалогію вобраза, абмаляваны Эдлай Гамільтон (М. Радзіёнаў). Аднак, шчыра кажучы, успрыняццю яго вельмі замінае аўтарская прэтэнзія на біяграфію Хемінгуэя ў абмалёўцы персанажа.

Сама Тэрэза (арт. З. Малчанава) атрымалася занадта руская — не адчуваецца ў ёй паўднёвага тэмпераменту.

«Дзень нараджэння Тэрэзы» стаў у тэатры днём нараджэння маладой актрысы Э. Копычавай. Яе Аманда стала галоўнай гераіняй спектакля. Танцаўшчыца з кабарэ, «цудоўная забаўка» здрадніка Апалоніо, яна пад уплывам падзей набывае сваю чалавечую годнасць.

Вобраз у выкананні Э. Копычавай развіваецца і расце арганічна, з вышэйшай дакладнасцю. Актрыса ў першай сцэне дае перспектыву гэтага развіцця. Вось яна ўвіхаецца вакол Антоніо. Экзатычны танец, Прага чуласці, чалавечнасці. Грацыёзнасць і прыгажосць. І раптам — танец зломлены. Постаць Аманды бяссільна нікне: яна зразумела, мабыць, упершыню, наколькі пустое, нікчэмнае яе існаванне. Адсюль пачынаецца паступовае адраджэнне, якое вянчаецца патэтычнай смерцю гордай кубінкі.

Спектакль шмат у чым абавязаны сваім поспехам яркаму выкананню гэтай ролі артысткай Э. Копычавай.

Чаго пакуль нестае спектаклю?

Па-першае, хочацца параіць тэатру адпрацаваць фінал. Цяпер спектакль мае некалькі канцовак, якія ідуць адна за другой і расхалоджваюць гледача.

Па-другое, мізансцэніроўка спектакля-плаката вымагае большай эканомнасці ў выкарыстанні сцэнічнай прасторы (хочацца, каб менш было «бытавых» мізансцэн — расседжванняў за столікамі, сядзячых размоў). А гэта вымагае і больш эканомнай дэкарацыі — без лішняй мэбліроўкі.

Да афармлення (яно выкананa пастаноўшчыкам А. Асаніным) ёсць і яшча адна істотная прэтэнзія. Навошта ў жанры гераічнай драмы ўжываць люмінесцэнтныя фарбы (партальны авал з бліскучымі пальмамі — гэта ўжо проста-такі безгустоўшчына).

Аб афармліцельскай культуры магілёўскіх пастановак, думаецца, варта было б павесці спецыяльную размову. Асабліва мяне здзівілі некаторыя рэчы ў «Такім каханні» Мастак А. Белаёраў, напэўна, зусім не адчуў жанр і стыль гэтага твора. Інакш ён не дазволіў бы сабе ў такой п'есе пускаць з каласніноў на сцэну «сапраўдны» дождж. А касцюміроўка спектакля? Адны дысанансы каляровай гамы... І гэта — у акварэльным пісьме псіхалагічнай драмы Кагоута.

Мастак, як і рэжысёр, павінен навучыцца разумець тое, што ён афармляе. Інакш яго дэкарацыі і касцюмы не будуць спрыяць разуменню твора гледачом.

* * *

Вывады па магілёўскіх спектаклях?

Напэўна, у гэтым выпадку лепш абмежавацца зробленымі заўвагамі.

Тэатр напярэдадні сезона перажыў складаную абстаноўку: змянілася кіраўніцтва (дырэктар і галоўны рэжысёр), значная частка трупы пакінула калектыў.

Добра, што калектыў усё ж не разгубіўся, перажываючы цяжкі перыяд рэарганізацыі: спектаклі тут выпускаліся рэгулярна. Няроўнасць іх мастацкіх якасцей пры такіх умовах была амаль што заканамерная.

А вывады няхай робіць сам тэатр і яго новае кіраўніцтва.

Дэманстрацыя беларускіх фільмаў у Парыжы

Дэлегацыя Беларускай ССР на XII генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКО ў Парыжы (Арганізацыя Аб'яднаных Нацый па пытаннях асветы, навукі і культуры) арганізавала для членаў дэлегацый краін, якія ўдзельнічаюць у рабоце канферэнцыі, супрацоўнікаў сакратарыята ЮНЕСКО і прадстаўнікоў прэсы паказ беларускіх кароткаметражных дакументальных фільмаў: «Мой горад», «Раніца жыцця», «Беларускія ўмельцы» і «Белавежская пушча».

Беларуская кінафільмы былі цёпла і з вялікай цікавасцю сустрэты шматлікімі гледачамі.

ТАСС.

Я люблю цябе, Мінск!



4. Але ў тэатр вы ўсё ж такі трапілі, хаця вашаму вачэрняму плацю ў перапоўненым трамваі магла пагражаць сур'ёзная небяспека. Нічога, маленькія непрыемнасці дня забываюцца вельмі хутка, калі ўзмахне сваёй палачкай адзін з мінскіх «маэстра», дырыжор тэатра оперы і балета Аляксей Нагадзееў. І Вердзі захопіць вас у чароўны палон музыкі «Рыгалета»...

У кожны дом, у кожную сям'ю

З красавіка па кастрычнік у Гомельскай вобласці праходзіў агляд работы сельскіх кніжных магазінаў, кіганош і бібліятэк, якія прадаюць кнігі. У аглядзе прымалі ўдзел магазіны спажывецкай кааперацыі, больш сямісот кіганош і 126 сельскіх бібліятэк.

Нядаўна былі падведзены вынікі агляду. Пераможцай прызнана кнігарня Калінкавіцкага райспажыўсаюза (загадчык тав. Ручаеўскі). Сярод пераможцаў таксама кніжныя магазіны Хойніцкага, Лельчыцкага і іншых райспажыўсаюзаў.

Лепшым кіганошам прызнаны сетачнік Добрушскага камбіната «Герой працы» камуніст Васільеў. За час агляду ён распаўсюдзіў грамадска-палітычнай і мастацкай літаратуры на 1400 рублёў. На 1200 рублёў прадала кніг кіганоша Калінкавіцкага райспажыўсаюза тав. Дуброўская.

Сярод бібліятэк, якія рэалізуюць літаратуру, лепшай прызнана бібліятэка Яромінскай сярэдняй школы.

Адзначана работа па распаўсюджванню літаратуры Кармянскага райспажыўсаюза (загадчык т. Вова, таваразнаўца па кнізе т. Андрэева). У раёне распаўсюджваннем кнігі займаецца 18 сельмагаў, райённая і народная кнігарні, 12 бібліятэк, 139 кіганошаў, пастаянна працуе 22 столікі без прадаўца, рэгулярна наладжваюцца вечары «Сябры кнігі», кніжныя базары.

Г. КАПЦЕЛАЎ.

«чыстай вады» — п'есу М. Гарулёва «Прызванне».

Тут, праўда, таксама ёсць «лёс», і таксама ён — лейтматыў у музычным афармленні. На гэты раз тэатр (разам з аўтарам) абралі тэму лёсу з Першага канцэрта Чайкоўскага. Гэты «лёс» не такі нахабны, як у «Такім каханні». Ён (або з-за транспаніроўкі, або з-за якасці гукавай апаратуры) увесь час неяк скардзіцца на сябе, вельмі жаласліва і маркотна, нібыта ён — бедны родзіч спектакля і п'есы — дзесьці на другім плане.

На першым жа плане ў пастаноўцы — людзі, падзеі і абставіны, якія на першы погляд маюць непасрэднае дачыненне да нашага сучаснага жыцця. Тут урачы — бацька і сын (паміж імі ідзе барацьба за новае ў медыцыне), настаўніца музыкі, малады рабочы завода. Ёсць тут гаворка і пра інтымныя справы.

Глядач слухае п'есу, хоча «чытаць» яе разам з тэатрам.

Шмат што абуджае жыццёвыя асацыяцыі.

Размова вучаніцы з настаўніцай аб прызванні... Дзяўчынка ўпершыню чуе горкую праўду: да справы якой яна сябе прысвяціла, у яе чяма таленту. Бывае такое? Так, бывае...

Жанчына з няўдалым першым каханнем знаходзіць сапраўднага сябра, але бацькі яго — супраць іх шлюбу... Таксама бывае.

Няшчасны выпадак, калецтва, барацьба за жыццё і здароўе, падтрымка таварышаў. Гэта — высакародства, знаёмае і дарагое ўсім нам.

Тан, усё, пра што напісаў М. Гарулёў у «Прызванні», бывае. Бывае і гора, і спачуванне, жыццёвыя ўдачы і цяжкасці і г. д. Праўду пра ўсё гэта людзі шукаюць у тэатры. Толькі ці Праўда — у п'есе «Прызванне»?

Давайце кінем цвяроза на драматычнасць яе падзей.

— Ты панінна сур'ёзна задумацца аб сваёй будучыні, — гаворыць Галіна сваёй вучаніцы. І яе меркаванняў выходзіць, што Волі неадкладна трэба кідаць заняткі па музыцы, інакш...

А што было б інакш? Дзяўчынка праз некалькі месяцаў скончыла б музычную дзесяцігодку і потым знайшла б сваё сапраўднае прызванне (у кансерваторыю яе, калі верыць Галіне, ніхто б не прыняў).

Дык навошта было заўчасна ўзнімаць перапалох?

Мы гэтага не ведаем. А аўтар — ведае. Ён ведае, што Галя выйдзе за Волінага брата, а там патрэбна будзе прычына для абвастрэння сітуацыі, вось ён і сварыць Галю і Волю. Гэтая сварка канчаецца тым, што Галя без памяці выскоквае з дому і трапляе... пад машыну.

Тут пачынаецца ўжо «грамадзянскі» матыў Іван Батурын, муж Галі, за тое, каб лячыць яе. А яго бацька, загадчык паліклінікі, супраць, бо лячэнне — рызыкоўнае.

Мукі Галіны (яна вельмі няшчасная: выхоўвалася ў дзіцячым доме потым — п'яніцамуж, потым — гэтая катастрофа і глухата, — разумеецца, што такое глухата для музыканта!), чуллівы акампанемент, охі ды ахі навокал.

— Здымі ты ў мяне камень з душы, — просіць свякруха ў Галі.

А Іван яе лечыць... употай ад усіх. А потым яму дапамагае сястра (яна стала сястрой і па службе, кінула музыку, робіць уколы... зноў-такі пад акампанемент Першага канцэрта Чайкоўскага).

Словам, на сцэне — меладрама. Што ад чаго ў ёй і што да чаго — цяжка зразумець. Напэўна, і тэатр (пастаноўка В. Шутава) не вельмі разумее, у імя чаго ён паставіў п'есу. Каб паказытаць слабыя нервы? Выклікаць жаль?

Пераказваючы змест п'есы, я ніяк не збіраўся яе парадзіраваць. Мне проста яшчэ раз шчыра хацелася ўцяміць, што «зразумеў» тут аўтар, што «зразумеў» тэатр і што яны хочуць навучыць разумець гледача.

Людзі на сцэне пакутуюць, стогнуць, сумуюць, злуюцца, сварацца. Потым, нібы перад Вялікаднем даруюць грахі адно аднаму і, памірыўшыся, «блаженно» ўсміхаюцца.

Вобразаў няма. Ёсць калейдаскоп нематываваных учынкаў. У гэтым калейдаскопе не можа разабрацца нават такі праніклівы майстар сцэны, як М. Радзіёнаў. Яго Батурын-старэйшы выглядае то неўрасценікам, то мудрым дзячком, то звягай, то мешчанінам. Тое ж адбываецца і з Е. Кашынай (яго жонка). Артыст Ю. Труханаў (Батурын-малодшы) трымаецца толькі на ўласнай артыстычнай прывабнасці. Б. Дружноў (Міця) з яўнай пагардай вымаўляе неарганічныя ў ролі маналогі аб паездцы ў Сібір. І толькі выканаўца ролі Галіны Е. Сакурава з усёй самаадданасцю паверыла меладраме і напластавала на тэкст тлусты слой меладраматычных прыёмаў ігры.

Дзіўнае ўражанне засталося ў мяне ад гэтага спектакля. Я прыслухоўваўся да рэакцыі гледачоў навокал. Адны з іх успрымалі п'есу цалкам: пакутвалі разам з Галінай — Сакуравай, міла радаваліся яе «выноснівасці» і з захапленнем апладіравалі фіналу, Іншыя недаўменна пераводзілі погляд са сцэны на суседзяў. Трэція пагардліва, з крыўдай уставалі і моўчкі пакідалі залу.

Такі ён, гэты жанр — меладрама. Ён вабіць многіх, але задавальне толькі тых, хто любіць проста «глядзець» і не хоча «чытаць» — думаць, шукаць адказы.

Ёсць у рэпертуары тэатра і «чыстая» камедыя-вадэвіль «У сябе ў палоне» М. Смірновай і М. Крайндэль у пастаноўцы рэжысёра А. Раеўскага. Шчыра кажучы, гэта быў лепшы з трох спектакляў, якімі магіляўчане адкрывалі сезон. Ён падкупляе шчырасцю, весялосцю, непрымусовасцю апавядання.

Светлая думка, закладзеная ў п'есе, — чалавек павінен заўсёды быць тым, што ён ёсць, — у спектаклі выяўлена праз магчымасці жанра і «чытаецца» лёгка, пад смех і воплескі апладысментаў.

У адрозненне ад іншых пастановак, тут маладыя ролі выконваюць маладыя артысты, і гэта таксама выгадна вылучае спектакль. Праўда, часам М. Веражны ў ролі Барыса Гарэлава злоўжывае трукацтвам, Э. Копычава (Маша Клімава) не ва ўсім адчувае свабоду сцэнічных паводзін, у Л. Закашанскага (Віця Белкін) ёсць некаторая сухаватасць. Аднак усё гэта, будзем спадзявацца, пры адпаведнай рэжысёрскай карэкціроўцы і «абкатцы» спектакля на гледачы выправіцца. Аснова яго — здаровая. Тут ёсць і бездакорныя выканаўчыя работы: З. Малчанава — Вера Андрэўна, Ю. Труханаў — Павел Рыгоравіч. Прыемнае ўражанне пакідаюць таксама В. Суднікава (Таня Валнухіна) і Н. Фядзяева (калгасніца Каця). Адзіны вобраз, які пакуль што выпадае з жанра і атмасферы спектакля, — пенсіянер Цюрын (арт. А. Яфрэменка). Ён занадта заграт

Я люблю цябе, Мінск!

5. Вячэрні Мінск. Вы ўжо здагадаліся, што гэтым здымкам хацеў выказаць фотамастак. Вячэрні горад з яго дыяментавым поясам створаных рукамі чалавека зорак, з агнямі тэатральных рампаў, з настольнымі лямпачкамі на пісьмовых сталах у кожнай кватэры, з... Адным словам, з усім прыемным, што прыносіць чалавеку вечар. Дарэчы, паняцце гэтае — вячэрні Мінск—для мінчан становіцца з кожным днём усё больш ёмістым. Вячэрні Мінск — гэта і экраны тэлевізараў, і спецыяльныя выпускі газеты «Мінская праўда», і радыёгазета, што так і называецца «Вячэрні Мінск»...

І вось ужо горад спіць. Горад адпачывае, каб заўтра з першымі промнямі зорні пачаць новы дзень — дзень працы, адпачынку, творчасці.

Фота С. АНАНКІ.

СПАЛОХАНЫ СВЕТ

Страх... У гэтым слове, як у фокусе, збіраюцца ўсе ніці, што вядуць да духоўнага крызісу сучаснага амерыканскага грамадства. Страх за заўтрашні дзень, нявер'е ў будучыню, няўпэўненасць у сваім становішчы — такі лёс радавога працаўніка гэтага «эльдарада капіталістычнага раю». Страх за сваё жыццё, жахлівае адчуванне свайго нераўнапраўя, боязь штомінутных здзекаў над сабой, над сям'ёй, над сваёй чалавечай годнасцю атручвае існаванне мільёнаў амерыканскіх неграў, што пакутуюць ад бясчынстваў расістаў і чалавеканенавіснікаў.

Страх закраўся і ў раскошныя асабнякі Уол-Стрыта, ва ўтульныя кабінеты ўладароў банкаў і кіраўнікоў манаполій. Жменька гэтых людзей, якая збірае ў мутнай вадзе чалавечых пакут добры ўлоў прыбыткаў, дрыжыць ад страху за свае капіталы, за раскошу, здабытую бессаромнымі рабаваннямі і злачынствамі.

Адчуваючы хістанне зямлі пад нагамі і свой непазбежны канец, імперыялізм кідаецца ва ўсе бакі і імкнецца знайсці прычыны гэтага крызісу. На пошукі кінуты «ўдарныя атрады» буржуазных ідэолагаў. У іх удзельнічаюць усе: былыя дзяржаўныя дзеячы і людзі, якія спадзяюцца стаць імі, афіцыяльныя буржуазныя прапагандысты і проста палітычныя прайдзісветы.

Гойсае па краіне з гэтым заданнем і былы прэзідэнт ЗША Дуайт Эйзенхауэр. Нягледзячы на свой узрост і нервы, якія былі сапсаваны шэрагам няўдач у мінулым, ён развінуў кіпучую дзейнасць. У маі гэтага года ў горадзе Абілене, штата Канзас, была адкрыта бібліятэка яго імя. Яна каштавала амерыканскаму народу 3 мільёны долараў і была запоўнена літаратурай, якая, на думку яе гаспадароў, павінна была «скіраваць амерыканца на шлях дабрачынасці».

На афіцыяльным адкрыцці яе выступіў сам Эйзенхауэр. Ён паспрабаваў у сваёй прамове «вынайсці бядоты нашага жыцця». Былы прэзідэнт знайшоў іх ва «ўпадку пачуцця прыгажосці і маралі ў Злучаных Штатах». Ён падверг крытыцы «вульгарнасць, сексуальнасць і звычайны бруд, які напаўняе большасць нашых кніг, газет і часопісаў». Тое, што справа абстаіць іменна так, неўзабаве пацвердзіў вядомы амерыканскі кінагандляр Чарльз Р. Фельдман. Ён даў такія афіцыйныя парады таму, хто хоча, каб яго фільм меў поспех: «Калі вы хочаце выгадна прадаць фільм, — прапагандуйце секс і гвалт. Гэта адзін з лепшых спосабаў зрабіць вядомых зорак з вашых акцёраў».

Фельдман не адзінокі ў сваіх перакананнях. У яго ёсць саюзнікі ва ўсіх галінах культурнага жыцця Амерыкі. Вось, напрыклад, толькі адна рэклама, якая была выдадзена з прычыны выхаду ў свет новага рамана: «Дзікі, непрыручаны, страсны. Герой дня. Жорсткі, удачлівы хлопец. Вораг чалавека. Ахвяра поспеху, становішча ў грамадстве, алкаголю, наркотыкаў, сексу, скальпавання галоў. Эксперыментатар на чалавечых пачуццях, напалавіну чалавек. Грамадскае бажаство і бяздумны, безадказны п'яніца. Яго любяць і ненавідзяць, яму зайздросцяць і ім пагарджаюць... Гэта Ідэн Крэйн, чалавек, які не падаўляў ні аднаго жадання ў сваім жыцці і чыя непаўналетняя жонка з'яўляецца ідэалам жанчыны. Яго жыццё — дзікая весялосць, якой маглі б дасягнуць і мы, калі б толькі паспелі!».

Пасля гэтых «перлаў», набраных каляровымі буйнымі літарамі, маленькімі літарамі напісана назва рамана «Обры Эдыкт». Пасля такой «рэкламы» сур'ёзныя чытачы спалохана адмахваюцца ад кнігі, не без падставы лічачы яе за адзін з экспанатаў выстаўкі «творчасці» пацыентаў псіхіятрычнай бальніцы. Але аўтар і не спадзяваўся на сур'ёзную аўдыторыю. Ён прызначыў свой баявік для тых, хто шукае лёгкай спажывы і «яркіх адчуванняў». І такія знаходзяцца! Начытаўшыся падобнай бязглуздзіцы, падлеткі самі адпраўляюцца «ў хвалюючыя падарожжы», якія звычайна заканчваюцца на лаве падсудных або ў камеры смяротнікаў.

Буйныя патокі гэтай бруднай халтуры запаўняюць сабой усе прылаўкі кніжных кіёскаў і магазінаў. Амерыканскай моладзі, якая прагна цягнецца да ведаў, падобны смярдзючы хлам прапануецца ў якасці «навейшых дасягненняў літаратурнай дзейнасці».

Не лепш абстаіць справа і ў тэлебачанні. Блакітныя экраны амерыканскіх тэлевізараў засмечаны брудным прыгодамі галівудскіх зорак, дрыжаць ад грукату капытоў каўбойскіх коней, трашчаць ад бесперапынных стрэлаў гангстэраў, якія дамучваюць на экране сваю чарговую ахвяру. Прэзідэнт адной з амерыканскіх тэлевізійных кампаній Джэймс Т. Обры, прама адзначае, што «тэлебачанне можа існаваць толькі тады, калі яно будзе распаўсюджваць тры факты: секс, гвалт, смех». Цяжка, зразумела, смяяцца, калі ты становішся ахвярай гвалту, калі ў цябе над вухам грымяць стрэлы. Таму, як правіла, смех сышоў з экранаў тэлевізараў зусім. Засталіся секс і гвалт. Кіраўнікі тэлекампаній задаволены; гэтыя вострыя прыправы ў прыкладай ідэалагічнай бурдзе зрабілі сваю справу. Пікантныя пошласці здольны вабіць да сябе непаўналетнюю моладзь. Моладзь кідае ў кішэню бізнесменаў добрыя грошы, а тыя паслужліва выліваюць на яе галаву мора інтэлектуальнага бруду.

Грамадства Амерыкі рэагуе на гэты сапраўдны шабаш ведзьмаў па-рознаму. Людзі, поўныя пачуцця адказнасці і страху за свой народ, рэзка выступаюць супраць гэтага сурагата культуры, нястомна змагаюцца за народнае мастацтва. Іх цікавіць будучае свайго народа, які яны хочуць бачыць адукаваным і шчаслівым. Прагрэсіўны амерыканскі журналіст Роберт Форш так характарызуе гэты духоўны крызіс: «Тэлевізійныя кампаніі сцвярджаюць, што амаральнасці вабяць да сябе гледачоў. Аднак тое ж самае можна сказаць аб пажарах і няшчасных выпадках. Але ці можа гэта служыць апраўданнем аднаго з буйнейшых сродкаў нацыянальнай культуры, які прапагандуе забойствы і эпізоды падпалаў? Ці ж мы дазволім прадаўцу дэлікатэсаў наняць у якасці рэкламы чалавека, які пагражаў бы скочыць з даху дзесяціпавярховага дома, калі людзі не будуць купляць прадукцыю ў яго гаспадара?» Форш лічыць, што гэтага дапускаць нельга. З ім згодна ўся прагрэсіўная грамадскасць Амерыкі. Лепшыя прадстаўнікі амерыканскай культуры стараюцца знайсці сапраўдную прычыну гэтай трагедыі.

Гэтым пытаннем заняты і многія дзяржаўныя дзеячы краіны. Але яны шукаюць адказ на яго не зусім там, дзе патрэбна. Яны падыходзяць да вырашэння праблемы з другога боку і стараюцца зрабіць адказнымі за свае злачынствы кагосьці іншага.

Нядаўна ў каледжы Айона, штата Нью-Йорк, са спецыяльнай прамовай перад студэнтамі выступіў сенатар-рэспубліканец Кеннет Б. Кітынг. Сенатар узмоцнена рэкламуе сябе як «абаронцу культурных вартасцей і ахоўніка дабрачыннасці». На гэты раз сенатар, як заўсёды, гаварыў аб культуры. Сваю размову ён назваў «Маральны крызіс у Амерыцы». Характэрна, што ў апошні час слова «крызіс», як адзначаў адзін амерыканскі гумарыст, фігуруе ў прамовах відных дзяржаўных дзеячоў адналькавую колькасць разоў са словам «працвітанне».

У сенатара Кітынга здарылася яшчэ горш. Сваю прамову ён адкрыў «крызісам» і закончыў тым жа. Ён са смуткам адзначаў: «Ганебным і жудасным парадоксам з'яўляецца тое, што ў час, калі наша ваенная магутнасць не ведае сабе роўных, наша духоўная сіла выдахлася і аслабела, як ніколі да гэтага». Сенатар імкнецца растлумачыць прычыны гэтага нацыянальнага няшчасця. Ён лічыць, што яны ляжаць у «багацці, матэрыялізме і апатыі». Сенатар спалоханы тым размахам «парнаграфічнай літаратуры і твісту», якія быццам «сімвалізуюць нашы прагнёўшыя вартасці». Кітынг не памыляецца. Багацце сапраўды стала прычынай буйнага росквіту амаральнасці. Але ён захапіў толькі тых, хто валодае багаццем, невялікую групу людзей, якія трымаюць у сваіх руках ключы ад асноўных жывіцельных артэрый краіны. Гэтая жменька дармаедаў, перанасычаная раскошай, атручвае сваімі адыходамі духоўную атмасферу, у якой задыхаецца працоўны люд ЗША.

Сенатар абвінавачвае ў сваіх няшчасцях матэрыялізм. І не адзін толькі ён. Як адзначае амерыканскі часопіс «Мэсыз энд мэйнстрым», у апошні час нападкі на матэрыялізм і камунізм, а таксама апісанне забойстваў і падпалаў сталі амаль адзінымі тэмамі, у якіх «спрабуюць» сваё пяро амерыканскія журналісты. Справа даходзіць часамі нават да спробы аб'яднаць іх. Вось пералік тэматыкі амерыканскага перыядычнага друку толькі за адзін тыдзень мая месяца гэтага года. Амаль кожная газета і часопіс сцвярджалі, што камунізм з'яўляецца «адзіным нашым ворагам». У той жа час на гэтых жа старонках яны паведамлялі аб асуджэнні мільянера, які хацеў незаконна пазбегчы выплаты падаткаў, аб арышце адваката, які спаліў свой дом, каб атрымаць страхавую ўзнагароду, аб двух грамадзянах Ейла, якія рабавалі таму, што ім «было сумна жыць» і г. д.

Эйзенхауэры, кітынгі, макарэны і ім падобныя не памыляюцца, калі яны бачаць у камунізме свайго духоўнага ворага. Тэорыя навуковага камунізма сапраўды накіравана супраць таго, хто мае намер затапіць народ у балоце амаральнасці і культурнай дэградацыі. Але за цяперашні крызіс духоўнага багацця ЗША нясе адказнасць не камунізм, а тыя, хто страцілі сумленне і чэсць у пагоні за долярам; хто імкнецца затапіць у катле спекуляцыі лепшыя здабыткі амерыканскай культуры.

І. АНТАНОВІЧ,
аспірант Інстытута філасофіі АН БССР.

Літаратура і мастацтва — Кансультацыя

Аддзел «Кансультацыя» зацікавіў многіх чытачоў нашай газеты. Вось, напрыклад, кінамеханік Вілейскага раённага аддзела культуры Мінскай вобласці тав. Буйвід просіць рэдакцыю адказаць на пытанні, якія яго доўго хвалююць. Яму адказвае начальнік планава-фінансавага аддзела Галоўнага ўпраўлення кінафікацыі і кінапракату Міністэрства культуры БССР М. Парамонаў.

Пытанне. Як трэба аплачваць кінамеханіку сельскай перасоўкі выдаткі па дастаўцы фільмаў, якія атрымліваюцца непасрэдна ў аддзяленні кінапракату?

Адказ. У гэтых выпадках паездкі кінамеханіка ў аддзяленне кінапракату для атрымання і здачы фільмаў павінны разглядацца як службовыя камандзіроўкі. Раённы аддзел культуры на падставе авансавай справаздачы абавязаны аплачваць кінамеханіку кошт праезду па тарыфу жорсткага аўтобуса.

Неабходна памятаць, што правоз фільмакопій на гаручай аснове пасажырскім транспартам катэгарычна забаронены.

Пытанне. Як павінна аплачвацца праца кінамеханіка перасоўкі, калі ён працуе адзін, без памочніка і матарыста?

Адказ. Памочнік механіка на кінаперасоўках не прадугледжаны тыпавымі штатамі. Пасада матарыста зацвярджаецца на кінаперасоўках, якія працуюць ад перасоўных электрастанцый. Сумяшчэнне пасады кінамеханіка і матарыста не дазваляецца і, значыць, ніякай даплаты кінамеханіку не належыць.

Падстава: загад міністра культуры БССР ад 18 ліпеня 1960 г. № 205.

ФОТАВЫСТАЎКА «СЯМІГОДКА Ў ДЗЕЯННІ»

У будучым годзе ў Маскве будзе праходзіць чацвёртая Усесаюзная мастацкая фотавыстаўка «Сямігодка ў дзеянні». У сувязі з гэтым Міністэрства культуры БССР вырашыла арганізаваць у лютым 1963 года ў Мінску чацвёртую рэспубліканскую мастацкую выстаўку «Сямігодка ў дзеянні».

Выстаўка ставіць сваёй задачай паказ лепшых твораў мастацкай фатаграфіі, якія раскрываюць поспехі камуністычнага будаўніцтва ў нашай рэспубліцы. На выстаўку будуць прымацца работы, якія адлюстроўваюць сродкамі фотамастацтва дзейнасць савецкага народа па ажыццяўленню рашэнняў XXII з'езда КПСС — з'езда будаўнікоў камунізма, поспехі, якіх дазмаглася працоўныя рэспублікі пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі за ўсіх галінах народнай гаспадаркі, у тэхніцы, культуры і мастацтве.

Па ўмовах на выстаўку можа быць прынята не больш 5 работ ад аднаго аўтара. За лепшыя работы будуць прысуджаны дыпломы і прэміі. Канчатковы тэрмін прыёму работ — 5 лютага 1963 года.

Міністэрства культуры стварыла арганізацыйны камітэт па правядзенню выстаўкі. У яго ўвайшлі вядомыя майстры беларускага фотамастацтва.

ШЧЫРЫЯ СУСТРЭЧЫ

У госці да чытачоў Мінскай бібліятэкі імя Л. М. Талстога прыйшлі беларускія паэты А. Вольскі і М. Аўрамчык.

Завязалася рікавая размова аб беларускай паэзіі. Паэты расказалі пра свой творчы шлях, чыталі вершы.

В. ЛІУШЫЦ.

Пісьменнікі Э. Валасевіч, М. Алексеєў, Р. Сабаленка пазнялі ўдзел у рабоце абласнога семінара лектараў-атэістаў г. Мінска. Аб ролі літаратуры ў антырэлігійнай прапагандзе расказаў Р. Сабаленка. Сцэну з антырэлігійнай п'есы прачытаў М. Алексеєў. З новымі байкамі пазнаёміў прысутных Э. Валасевіч.

Ул. ГУСЕЎ.

Вечар беларускай паэзіі адбыўся у Інстытуце замежных моў. Сюды прыйшлі паэты М. Луканік, Р. Барадулін, Н. Гілевіч. Яны чыталі вершы аб Радзіме і партыі. У інстытуце быў арганізаваны продаж кніг. Многія набылі зборнікі з аўтографамі.

С. ВАЛЕРАЎ.

У гарадскім Доме культуры г. Слуцка адбылася сустрэча з былым абаронцам Брэсцкай крэпасці пісьменнікам А. Махначом. Ён расказаў прысутным аб гераізме савецкіх людзей у гады Айчыннай вайны, аб подзвігу абаронцаў крэпасці над Бугам. У заключэнне прысутныя прагледзелі фільм «Цытадэль славы».

Н. СКУРАТОВІЧ.

У РЭДАКЦЫЮ ГАЗЕТЫ «ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Паважаны тав. рэдактар!

Дазвольце праз Вашу газету выказаць глыбокую ўдзячнасць усім арганізацыям і ўстановам, сябрам і таварышам, якія прыслалі свае віншаванні з выпадку 50-годдзя з дня нараджэння.

Юліян ПШЫРКОЎ.

ФЕЛЬЕТОН

Цудадзейныя грамы

СЦЭНАРЫЙ КАРОТКАМЕТРАЖНАГА ДАКУМЕНТАЛЬНАГА ФІЛЬМА

□ □

...Заводакіраўніцтва працуе з максімальнай нагрузкай — рыпяць пёры, трашчаць арыфмометры, стракоча машынка... Вопытныя планавікі і бухгалтары—усе мудруюць над тэкстам выступлення.

...Рукі (буйным планам) трымаюць прыгожа аформленую справаздачу, потым яны, гэтыя рукі, гартаюць старонку за старонкай. Мы ўжо бачым самога Міхаіла Саламонавіча Берышвілі—дырэктара Мінскага маргарынавага завода.

— Справаздача, скажу я вам, атрымалася на славу!

— Ды хіба ж толькі на славу?— з ноткамі крыўды пытаецца бухгалтар. — Ці ж мы прэміі не заслужылі?

— Чаму ж, у хвасце не цягнемся. Тут вось чорным па белым напісана аб перавыкананні плана.— Дырэктар чытае асобныя мясціны і самазадаволена пагладжвае ўказальным пальцам шчотачку вусоў.

— Кожная старонка вашага, таварыш дырэктар, выступлення расказвае пра бліскучыя поспехі падначаленага вам прадпрыемства і пра асабістыя вашы заслугі.

— Што ж, творчай фантазіі вам не пазычаць. Той-сёй з пісьменнікаў нават пазайздросціць можа!

Ад гэтай дырэктарскай пахвалы бухгалтара аж праймае сляза замілавання. Яна, няпрошаная, яшчэ больш натхняе Міхаіла Саламонавіча, і ён з невыказным энтузіязмам штурмуе тэкст свайго выступлення.

...Лічбы, лічбы.

Нібы на парадзе, стройныя калонкі кругленькіх, як бочачкі з маргарынам, лічбаў. Яны па ўсёй форме рапартуюць начальству аб дасягнутым росце выпуску прадукцыі, аб эканоміі сыравіны...

...Міхаіл Саламонавіч, яшчэ весялей бліскаючы акулярамі, уголас чытае характарыстыку тых лічбаў, і ў думках пераносіцца са свайго кабінета на высокую трыбуну Упраўлення харчовай прамысловасці Саўнаргаса БССР. Ён чытае заключныя радкі і ў ягоным голасе гучаць то далікатныя скрыпкі, то фанфарныя трубы:

—Завод з году ў год трымае першынство, неаднаразова прэміраваны... І асмелюся вас запэўніць, што слаўны наш калектыў не выпусціць з рук пераходны сцяг.

— Вось якраз у гэтым месцы,— усміхаецца бухгалтар,—стэнаграфістка запіша ў дужках—вясёлае ажыўленне ў зале. Працяглыя і гучныя апладысменты.

... У гэты момант на дырэктарскім стале назойліва зашамацела нейкая паперка. Яна вылузалася з канверта і трапіла на вочы Берышвілі.

— Пачакай, пачакай, міленькая, ты мабыць з перыферыі? Дык можа і ты закінеш пару цёплых слоў пра нашу плённую дзейнасць? От вазьму ды ўключу цябе ў маё выступленне. Так што давай пазнаёмімся з табою.

Але знаёмства было не з прыемных, бо вось пра што загаварыла «міленькая з перыферыі»:

— У атрыманых Акнісцкай спажыўкааперацыяй (Ілукскі раён, Латвійская ССР) чатырох скрынях маргарыну з Мінскага маргарынавага завода не хапіла 9,4 кілаграма маргарыну.

Берышвілі:

— Ах, ты так са мною размаўляць? Будзеш у мяне ляжаць вось тут.

Ён расчыняе шафу. Але з паліцы пачалі скакаць на падлогу такія ж «міленькія».

На іх пячаткі розных устаноў розных гарадоў: Калінінская універсальная база спажыўкааперацыі, Бранскі халадзільнік, Гродзенская база мясарыбгандлю, Карэльскі халадзільнік...

Цітры:

«Не хапае маргарыну ў стандартных скрынках, у расфасаваных пачках».

«Не хапае тлушчу ў бочках!»

Чуюцца галасы:

— Не хапае. Ага, колькі не хапае!

— Я патрабую папраўкі на сем кілаграмаў маргарыну!

— А я больш чым на 43 кілаграмы тлушчу!

— Я на трыццаць кілаграмаў...

Рука Берышвілі (зноў буйным планам) пацягнулася да пяра, пяро да чарніліцы—і на паперы з'явілася рэзалюцыя: «Адгрузіць недахоп за кошт завода».

— Ну, цяпер чаго вам не хапае? — фанабэрыста пытаецца Берышвілі. Яму кідаюцца ў вочы заключныя словы адной рэкламацыі.

Цітры:

«Завод, відаць, даўно сумуе па кантралёру!»

...Раптам адчыняюцца дзверы.

— Добры дзень, — мы кантралёры!

— А што вас, даражэнькія, сюды прывяло? — здзіўляецца дырэктар. — Здаецца... мы не з адстаючых.

— Нас прывяла сюды вось гэтая скарга.

Дырэктар працірае акуляры, спагадліва ўсміхаецца:

— Ну, ці варта было такім занятым людзям турбавацца з-за нейкіх там грамаў няшчасных? Пакіньце прэтэнзію і мы адразу яе здаволім. Бывае, здараецца, калі якая-небудзь там расфасавачная машына памылачку дапусціць.

...На заводзе, на халадзільніках, складах і магазінах ідзе кантрольнае ўзважванне маргарыну — у скрынках і асобна ў расфасаваных пачках. Кантралёры знаёмяцца з «памылкамі» і «памылачкамі». Іх многа. Аж занадта.

Цяпер перад Берышвілі выстраіліся калонкі лічбаў без усялякай аздобы, голенькія, як народная маці-маніпуляцыя іх нарадзіла.

На экране — лічбы.

5, 25, 4, 3, 2...

Гэта па столькі грамаў не хапае ў кожнай са стаграмовых пачак. 396, 474, 500...

Гэта па столькі грамаў не хапае ў кожнай скрынцы маргарыну.

Цітр:

«З недаважаных спажыўцу грамаў складаюцца кілаграмы, цэнтнеры і тоны, што ідуць аматарам лёгкай нажывы».

...Ідзе пасяджэнне камісіі дзяржкантролю.

— У адной толькі гатовай для адпраўкі невялічкай партыі ўзятых на кантрольную праверку скрынак не хапіла 80 кілаграмаў маргарыну вышэйшага гатунку...

Гэта кантралёр чытае акт рэвізіі.

— А колькі такіх недахопаў!

...Бягуць, бягуць расфасованыя пачкі... Хуценька ўкладваюцца ў роўненькія радкі і ў момант запаўняюць скрыні.

Кантралёр:

— Яны, гэтыя недахопы, не кідаюцца адразу ў вочы, бо прыкрыты вясёлкавымі этыкеткамі, салідными трафарэтамі і аўтарытэтнай заводской маркай.

...Скрыні, упрыгожаныя трафарэтамі, строяцца ў шарэнгі. Запаўняюць вагоны... Паравозы, ускінуўшы грыву дыму, імчаць эшалоны...

Кантралёр:

— Завод з'яўляецца буйнейшым пастаўшчыком маргарыну! Але...

Голас з месца:

— Але з недахопамі, якіх па самае досыць хапае на добрую папраўку тым, хто дужа ўжо любіць пагрэць рукі за кошт спажыўцоў.

Берышвілі нервова цярэбіць шчотачку вусоў.

Голас з месца:

— Хто вінаваты ў недаважванні маргарыну?

Берышвілі:

— Расфасавачныя машыны. Яны знасіліся.

Рэпліка з месца:

— Ох, і хітрыя ж машыны: працуюць з мінусамі для спажыўцоў ды з плюсамі для вас. Ці не так я кажу?

Пра гэта дырэктар лічыць за лепшае сціпла маўчаць.

— Што датычыцца сціпласці, то Берышвілі наогул не ведае, з чым яе ядуць, відаць, з гэтай прычыны і ходзіць ён у пераможцах. Я прапаную строга пакараць дырэктара...

— Налічэнне! — шэпча на вуха Берышвілі галоўбух завода Пяткевіч.

Ад страху Берышвілі аж заплюшчыў вочы і ўвабраў голаву ў плечы. Ён увачавідкі ўбачыў, як ляцяць з яго кішэні і горка плачуць рублёўкі, трохрублёўкі, пяцёркі... Свае грошы!

Баранаў (старшыня камісіі):

— Таварышы, я таксама за самае суровае пакаранне. Адважым Берышвілі вымову... і гэтым будзе пастаўлена кропка над «і».

Намеснік начальніка Упраўлення харчовай прамысловасці Саўнаргаса БССР тав. Логінаў кідае падбадзёрваючы позірк на Міхаіла Саламонавіча, а ў таго вочкі аж бліснулі вясёлымі агеньчыкамі.

На экране—«і» з кропкай. Кропка над «і» таксама расплываецца. Сагнулася яна, кульнулася і ператварылася ў вялікі «?». Ён стаў на ўвесь свой рост побач з тав. Логінавым і на ўвесь голас пытаецца:

Пытальнік:

— Колькі можна, Васіль Лаўрэнавіч, любаваца сабою ў крывым люстэрку лоўка прычэсанай і прыбранай справаздачнасці падначаленых вам прадпрыемстваў і не заўважаць пытальнікаў? Чаму гэта ўсім Вашым штатам аніяк не можаце ўбачыць нават тое, што тут пад носам дзеецца?

Цітр: «Пытанне застаецца адкрытым. Пакуль што, вядома»...

Лявон ВІРНЯ.

БЛУКАННІ ПА ПАКУТАХ

ПІСЬМО Ў РЭДАКЦЫЮ

Наш сельскі Дом культуры трэба рамантаваць. Склалі мы каштарыс на капітальны рамонт, і я звярнулася з ім у мясцовую арганізацыю Міжкалгасбуда. Але там спачатку нават не захацелі гаварыць са мной, а пасля інжынер Б. Спірыдонаў паабяцаў зрабіць рамонт у кастрычніку. А калі прыйшоў кастрычнік, дык ён і зусім адмовіўся ад сваіх слоў. Паскардзілася я парторгу Кобрынскага тэрытарыяльнага вытворчага калгасна-саўгаснага ўпраўлення М. Клімцу. Тады ў Міжкалгасбудзе паабяцалі задаволіць нашу просьбу. Назаўтра старшыня будаўнічай арганізацыі З. Шухман накіраваў мяне да галоўнага бухгалтара В. Сакалоўскага. Я ўзрадавалася. Нарэшце зробяць рамонт, і мы зможам зімою працаваць.

Але радасць мая была заўчасная... В. Сакалоўскі накіраваў мяне да ўжо вядомага мне Б. Спірыдонава, які ўзяў каштарыс і, паклаўшы яго ў стол, папрасіў мяне пазваніць яму заўтра. А назаўтра зноў адклаў размову.

Нашы блуканні па пакутах не спыняюцца. Хочацца запытацца, ці доўга так будзе?

В. ТАРАСЮК,
дырэктар Стрыгаўскага сельскага Дома культуры.
Кобрынскі раён.

Учора артысты Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета паказалі прэм'еру оперы «Джаконда» італьянскага кампазітара Панк'елі. Пастаноўка оперы ажыццёўлена на беларускай сцэне ўпершыню.

У новым спектаклі ролі выконваюць артысты Т. Шымко, Л. Галушкіна, А. Генералаў, В. Ганчарэнка і іншыя. Дырыжор спектакля—І. Абраміс. Рэжысёр—Д. Смоліч. Мастацкае афармленне П. Масленікава.

У ролі Джаконды вы бачыце артыстку Т. Шымко, Лаўры — артыстку Л. Галушкіну.

Фота Ул. КРУКА.

РЭДКІ І ЦІКАВЫ СКАРБ

У невялікім старэнькім доме, пасярод вёскі Міхалкавічы, жыве са сваёй жонкай 82-гадовы Іван Адамавіч Гладкі. Неналі гэты дом, як расказваюць мясцовыя жыхары, быў цэнтрам культурна-масавай работы на вёсцы. У І. Гладкага былі два браты настаўнікі і ў доме іх ніколі не выводзілася кніга.

Нядаўна я быў на кватэры ў Івана Адамавіча, пацікавіўся той літаратурай, якую ён збярог да сённяшніх дзён. Я ўбачыў многа рэдкіх кніг і часопісаў. Сярод іх выдадзеныя ў розныя часы творы рускіх класікаў, а таксама Я. Коласа, Я. Купалы, Зм. Бядулі, М. Багдановіча і іншых.

Вось у руках маіх рэдкае выданне «Пана Тадэўша» ў перакладзе на беларускую мову В. Дуніна-Марцінкевіча. Выпушчана яно ў свет у 1908 годзе пецярбургскай выдавецкай суполкай «Загляне сонца і ў наша ваконца». У прадмове «Слова ад выдаўцоў» гаворыцца:

«Пускаем у свет шырокі дзве першыя быліны «Пана Тадэўша», перакладзеныя на нашу мову. Цяжкая выпала доля гэтай кнігі. Убачыла яна свет божы ў 1859 годзе. На грошы, што шмат людзей злажылі, а паміж іх былі і мужыкі, пачалі яе друкаваць у Вільні з дазволу тагачаснага цэнзара Кукальніка. Трэба ж, што акуратна, як толькі акончылі друкаваць дзве першыя быліны, на месца Кукальніка назначылі новага — нейкага Мухіна. Той вельмі строгі ўдаўся і адразу ж прысудзіў «Пана Тадэўша» ў свет не пускаць. Так і не паспелі быліны зірнуць на свет той ясны: іх арыштавалі і спалілі. Засталося толькі дзветры кніжкі».

З адной з іх, што захоўвалася ў бібліятэцы Краўскага універсітэта, і перадрукавана гэтае выданне.

У канцы кнігі, на тытульным лісце, паведамляецца аб іншых выданнях суполкі: «Дудка беларуская» М. Бурачка, «Вязанка» Я. Лучыны, «Першае чытанне для дзетак» Цёткі.

Не менш цікавая «Паўлінка» Я. Купалы, надрукаваная на гектографе. Якога года гэтае выданне, цяжка сказаць: не захавалася ні вокладкі, ні першых старонак.

А вось два выданні «Тараса на Парнасе». Адно датуецца 1917 годам (Мінск, друкарня Я. Грынблата), другое — 1909 годам (Вільня, «Наша ніва»).

У ліку іншых кніг, якія я знайшоў у бібліятэцы Івана Адамавіча — апавяданне для дзяцей «Дзядзька Голад» (1911 г., Вільня), «Хто чым жыве» (пераклад з рускай мовы, 1918 г.), зборнік твораў беларускіх пісьменнікаў, выдадзены пасля рэвалюцыі 1905 года, «Беларускі каляндар», «Яўгеній Анегін» А. Пушкіна (1902 год) і іншыя.

Іван Адамавіч захаваў камплекты беларускіх часопісаў «Саха», «Плуг», «Вольны шлях», «Узвышша», некалькі экземпляраў газеты «Беларуская вёска».

Частну кніг Іван Адамавіч раздаў насельніцтву, а частка загінула ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Але і тое, што захавалася, мае немалую цікавасць для гісторыі беларускага кнігадрукавання.

Б. САСНОЎСКІ.
Лагойскі раён.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТРАЛЬНА-МАСТАЦКІ ІНСТЫТУТ

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС

на замяшчэнне вакантнай пасады

ЗАГАДЧЫКА КАФЕДРЫ ЖЫВАПІСУ — ПРАФЕСАРА ЦІ ДАЦЭНТА

Тэрмін падачы заяў на конкурс — 1 месяц з дня апублікавання аб'явы ў друку.

Заявы і дакументы накіроўваць па адрасу: г. Мінск, Ленінскі праспект, 81. Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ТУБАРЭВІЧ, В. Ул. ІВАШЫН, А. Н. МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), П. Ф. ПРЫХОДЗЬКА, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), М. Г. ТКАЧОЎ, І. З. ШАРАХОЎСКІ, І. Б. ШАЦІЛА, Р. Р. ШЫРМА.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Адрас рэдакцыі: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі—3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара—3-25-25, адказнага сакратара—3-25-25, аддзела літаратуры—3-22-04, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры—3-22-04, выдавецтва—3-19-52, бухгалтэрыі—3-11-03

«Літаратура і мастацтва» выходзіць два разы на тыдзень: у аўторак і пятніцу

АТ 10247

Друкарня выдавецтва «Звязда».